Працаўнікі усіх краін, злучайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі

№ 5
САКАВІК
1936 г.

МАРЫЯ ЯНОЎСКАЯ, калгасніца вёскі Кавальцы, Дзержынскага раёна, за выдатныя заслугі па ахове граніц нашай радзімы ўзнагароджана ЦВК СССР ордэнам „Знак Почета".

АБ ВЫЛУЧЭННІ ЖАНЧЫН У ДЗЕРЖЫНСКІМ І ЦЕРАХОЎСКІМ РАЁНАХ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае, што праверкай сельскагаспадарчым аддзелам ЦК становішча работы па вылучэнню жанчын на кіруючую і адказную работу ў калгасах Дзержынскага і Церахоўскага раёнаў установлена, што як у мінулым, так і ў даны час гэта работа праходзіць зусім нездавальняюча.

З агульнай колькасці ў Дзержынскім раёне 128 старшынь калгасаў—жанчын толькі 2 чал. З 200 калгасных брыгадзіраў—тры жанчыны; з 221 трактарыста—адна жанчына.

Аналагічнае становішча і ў Церахоўскім раёне, дзе ўсяго два старшыні калгасаў—жанчыны (з 78 калгасаў). Жанчын-брыгадзіраў толькі 14 з 341 брыгады і ні адной трактарысткі.

У Дзержынску на курсах трактарыстаў з 193 чалавек навучаецца толькі 7 жанчын, у Церахоўскім на 169 чалавек, якія навучаюцца на розных курсах,—13 чал. жанчын.

Гэта сведчыць аб тым, што партыйнае і совецкае кіраўніцтвы Дзержынскага і Церахоўскага раёнаў яўна не зразумелі і недаацанілі велізарнага палітычнага значэння, сказанага таварышам Сталіным на першым усесаюзным з'ездзе калгаснікаўударнікаў, што жанчына ў калгасе—вялікая сіла, і ўказанні СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 19/XII 1935 г. аб нячорназемнай паласе—аб тым, каб „дабіцца на працягу бліжэйшых 1—2 год, каб значная частка старшынь калгасаў, калгасных брыгадзіраў, трактарыстаў, камбайнераў і працуючых на трактарных машынах па ільну і бульбе, калгасных рахункаводаў і загадчыкаў калгасна-таварных ферм былі-б жанчыны-калгасніцы".

ЦК КП(б)Б прапануе кіраўніцтву даных раёнаў—РК Дамброускаму і Кечкіну склікаць спецыяльна па гэтаму пытанню райпартсходы, паведаміць на гэтых сходах аб памылковых і няправільных адносінах да гэтага пытання РК, РБК і намеціць рад практычных мерапрыемстваў па вылучэнню жанчын, паведаміўшы аб гэтым у ЦК не пазней 15/III.

ЦК КП(б)Б прапануе НКЗБ прыпыніць работу курсаў па падрыхтоўцы калгасных кадраў у Дзержынскім і Церахоўскім раёнах (за выключэннем курсаў трактарыстаў) аж да ўкамплектавання іх адпаведнай колькасцю жанчын. Абавязаць сакратароў РК тт. Дамброўскага і Кечкіна асабіста перагледзець склад слухачоў курсаў і ў 5-дзённы тэрмін давесці склад жанчын калгасніц да 35—50 проц. усёй колькасці курсантаў.

ЦК КП(б)Б лічыць, што Наркамзем БССР не забяспечыў кантролю і кіраўніцтва справай набору курсантаў і тым самым парушыў прамое ўказанне ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб уцягненні ў лік курсантаў па падрыхтоўцы тэхнічных кадраў значнай колькасці жанчын.

ЦК КП(б)Б прапануе НКЗему праверыць склад курсаў па падрыхтоўцы тэхнічных кадраў па ўсіх раёнах і МТС і забяспечыць у складзе курсаў 30—50 проц. жанчын-калгасніц.

Абавязаць РК партыі аказваць усямерную дапамогу ў гэтай справе НКЗему, папярэдзіўшы, што за адсутнасць работы яны будуць прыцягвацца да найстражэйшай партыйнай адказнасці.

ЦК КП(б)Б абавязвае сельгасаддзел устанавіць сістэматычны нагляд за выкананнем Наркамземам і райкомамі партыі гэтай пастановы.

Указаць усім РК і ГК КП(б)Б, што яны павінны ўлічыць данае рашэнне ЦК і неадкладна перабудаваць сваю работу ў справе вылучэння жанчын-калгасніц на кіруючую работу, у трохдзённы тэрмін распрацаваўшы канкрэтныя мерапрыемствы па практычнаму правядзенню ў жыццё ў калгасах пункту статута сельгасарцелі аб уцягненні жанчын у калгасную вытворчасць і вылучэнні вопытных, здольных жанчын на кіруючую калгасную работу.

У прыватнасці ЦК КП(б)Б абавязвае сакратароў РК у выпадку ўзнікнення неабходнасці замены ці перасоўкі старшынь калгасаў ці брыгадзіраў вылучаць на гэту работу здольных, вопытных жанчын, узгадніўшы перасоўку старшынь калгасаў з НКЗемам БССР і сельгасаддзелам ЦК КП(б)Б.

Даручыць сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б праверыць стан работы па правядзенню ў жыццё статута сельгасарцелі аб жанчыне ў калгасах Рагачоўскага, Клімавіцкага, Веткаўскага і Касцюковіцкага раёнаў, з пастаноўкай рэзультатаў на бюро ЦК КП(б)Б.

ЦК лічыць зусім недастатковым удзел комсамола ў падборы і вылучэнні жаночых маладзёжных кадраў, як на кіруючую работу ў калгасах, так, асабліва, на ўсякага роду курсы па падрыхтоўцы кадраў, у прыватнасці трактарныя курсы і курсы камбайнераў.

ЦК абавязвае ЦК ЛКСМБ прыняць усе неабходныя меры па ўзмацненню ўвагі ўсіх райкомаў комсамола справе камплектавання курсаў за лік жаночай моладзі.

ЦК ЛКСМБ павінен паставіць сваёй задачай сфармаваць у 1936 годзе не менш 10—15 маладзёжных жаночых трактарных брыгад.

ЦК даручае аддзелу друку арганізаваць асвятленне ў цэнтральных і раённых газетах пытанняў, звязаных з выкананнем калгасамі статута сельгасарцелі аб уцягненні жанчын у калгасную вытворчасць і вылучэнні іх на кіруючую работу. У бліжэйшую дэкаду даць рад заметак аб вылучэнні жанчын-калгасніц па калгасах Рагачоўскага, Клімавіцкага, Веткаўскага, Касцюковіцкага раёнаў, а таксама аб ходзе падбору арганізацыі і работы курсаў трактарыстаў, камбайнераў, ільноцерабільшчыкаў і інш.

ЦК абавязвае Народны камісарыят аховы здароўя і Наркомасветы неадкладна-ж прыступіць да распрацоўкі мерапрыемстваў па разгортванню і абсталяванню на 1936 г. дзіцячых ясляў, пляцовак, дзетсадоў і паляпшэнню работы ўжо існуючай сеткі. К 25 сакавіка прадставіць у ЦК увесь матэрыял па гэтых пытаннях.

ЦК абавязвае ўсе РК КП(б)Б мабілізаваць калгасную грамадскасць вакол пытанняў ясельнай справы і абслугоўвання падросткаў, завастрыўшы асаблівую ўвагу на падборы кіраўнікоў дзіцячым ўстановамі.

Сельгасаддзелу ЦК у далейшым сістэматычна правяраць стан работы па вылучэнню жанчын-калгасніц, з пастаноўкай вынікаў на бюро ЦК. У прыватнасці, лічыць неабходным накіраваць на кіруючую работу ў НКЗем групу праверaных работнікаў з жанчын.

Соўгандальаддзелу ЦК па сваёй лініі правесці дадаткова праверку становішча вылучэння жанчын

АБ МІЖНАРОДНЫМ КОМУНІСТЫЧНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНІ „8 САКАВІКА"

ПАСТАНОВА ЦК ВКП(б)

8 сакавіка—міжнародны комуністычны жаночы дзень—працоўныя Совецкага Саюза сустракаюць у абстаноўцы новых перамог соцыялізма, велізарнага творчага стаханаўскага ўздыму рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц.

Ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, у магутным, усенародным руху за падняцце прадукцыйнасці соцыялістычнай працы, за падняцце ўраджайнасці сельскай гаспадаркі працоўныя жанчыны СССР праявілі велізарную творчую ініцыятыву, актыўнасць і найвялікшы працоўны гераізм.

З радоў жанчын вышлі піонеры ў барацьбе за высокую прадукцыйнасць працы ў прамысловасці і транспарце—Еўдакія і Марыя Вінаградавы, Одзінцова, стрэлачніца Неудахіна і інш., і застрэльшчыкі ў барацьбе за высокую ўраджайнасць соцыялістычных палёў, паказаўшыя сусветныя рэкорды (пяцісотніцы бурачных палёў—Марыя Дземчэнка і інш. рэкардысткі ўраджайнасці баваўняных палёў—Огуль Гузель Бахбід, Аманава Тахта-Бібі і інш.), майстры новай сельскагаспадарчай тэхнікі (трактарная брыгада Пашы Ангелінай).

Соцыялістычны лад вылучыў новых жанчын—гераінь працы і акружыў іх павагай і пашанай усёй краіны.

Жанчыны паказалі выключную адвагу і самаадданасць у абарончай рабоце і ў фізкультурным руху, як актыўныя члены Асоавіяхіма, санітарных атрадаў, фізкультурных арганізацый (лётчыкі, парашутысткі — Камнева, Фёдарава, планерысткі рэкардсменкі лёгкай атлётыкі, выдатныя варашылаўскія стралкі, удзельніцы гераічных лыжных пераходаў і інш.).

Працоўныя жанчыны Совецкага Саюза ўсвядомілі, што ў краіне, ліквідаваўшай назаўсёды лад эксплаатацыі і рабства, далейшы рост матэрыяльнага і культурнага ўзроўню кожнай жанчыны залежыць ад яе шчырасці ў соцыялістычнай працы, ад яе ўпартасці ў барацьбе за аўладанне граматай, тэхнічнымі ведамі.

ЦК ВКП(б) пастанаўляе:

1. Міжнародны комуністычны жаночы дзень „8 сакавіка" правесці, як масавую палітычную кампанію з паказам бяспраўя працоўных жанчын у капіталістычных краінах, гнёту, эксплаатацыі і фашысцкага тэрору, якія цяжарам ляжаць над імі, і—пераваг эканамічнага і прававога становішча жанчын Совецкага Саюза, перамог і поспехаў жанчын СССР у барацьбе за соцыялізм, за культурнае, заможнае жыццё.

2. Абкомам, крайкомам і іншым партарганізацыям правесці дзень „8 сакавіка" як народнае свята, акружаючы асаблівай увагай і пашанай жанчын-гераінь, выдатных стаханавак прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі і абарончай работы, мабілізуючы актыўнасць працоўных жанчын на далейшую работу за выкананне і перавыкананне плана другой пяцігодкі.

ЦК ВКП(б)

4 сакавіка 1936 года.

ЗА ШТО Я АТРЫМАЛА ОРДЭН ЛЕНІНА

Рыгаровіч Софья Антонаўна—даярка соўгаса „Рачкавічы", Чырвона-Слабодскага р-на

Ніколі ў жыцці не думала я, што буду ў Маскве і ўбачу таварыша **Сталіна**. Куды мая старасць падзелася? Адразу я быццам памаладзела.

Спачатку мне неяк страшнавата стала быць разам з кіраўнікамі партыі і ўраду, а потым, калі ўбачыла, што сабраліся ўсе свае, убачыла ласкавае абыходжанне з намі нашых кіраўнікоў, а асабліва таварыша **Сталіна**, мне адразу так добра зрабілася, так прыемна, як ніколі ў жыцці не было.

Усё не верылася мне, што я паеду ў чырвоную сталіцу. Сядзела я ўвечары і даіла карову, а парторг наш паклікаў мяне, каб збіралася ехаць. Я скончыла даіць, устала, пераапранулася і паехала. Трэба праўду сказаць—непакоілася, каб з каровамі маімі што-небудзь не здарылася. Але дырэкцыя соўгаса вызначыла даглядаць і даіць маіх кароўак лепшую работніцу Маню Есманчык, якой я спакойна даручыла жывёлу, а сама паехала на нараду.

Чым я дабілася такога гонару, каб быць разам з нашымі кіраўнікамі, убачыць таварыша Сталіна і атрымаць вышэйшую ўзнагароду—ордэн Леніна? Расказаць аб сваёй рабоце цяжэй чым зрабіць. Калі я працавала, я не думала пра ўзнагароду.

Я вельмі люблю сваіх 17 кароў. Заўсёды яны ў мяне дагледжаныя, пачышчаныя, своечасова накормленыя. Перад дойкай падмываю вымя, насуха выціраю і хутка выдайваю.

Даю я кароў абавязкова пяць разоў у дзень, а іншую карову даю праз кожныя дзве гадзіны. Трэба добра выдайваць карову, тады яна будзе больш малака даваць. Маладую карову—першацёлку „Даліну" я раздаіла так, што яна дала 4.000 літраў малака.

У мінулым годзе я са сваіх 17 кароў надаіла 67787 літраў малака пры плане ў 44.000, што складае ў сярэднім па 3980 літраў на кожную карову, а паасобныя рэкардысткі далі па 4.000—4.130 літраў. На нарадзе ў Маскве я заключыла соцумову з даяркай соўгаса „Дабрынь" тав. Каўдзерка і ўзяла на сябе абавязак атрымаць у 1936 годзе ад 12 кароў столькі малака, колькі ў мінулым годзе атрымала ад 17.

10 маіх кароў рэкардыстак занесены ў дзяржаўную племянную

Тав. Рыгаровіч У.

кнігу. Вядома, калі-б я была больш граматнай, мне лягчэй было-б працаваць. А ўсё-ж такі хоць і 52 гады мне ўжо, а працую я не горш за маладых. Зараз ужо маладыя даяркі прыходзяць да мяне і пытаюцца як трэба лепш працаваць. Я ім усё раскажу, вучу іх. Хачу, каб усе нашы даяркі былі стаханаўкамі, каб атрымлівалі ад сваіх кароў больш малака.

Я ўсё сваё жыццё батрачыла і бацька мой быў батрак, а з 1927 года я працую даяркай у соўгасе. Спачатку ў нас справа не ладзілася. Панавала ў нас абязлічка. Даяркі толькі даілі кароў і не даглядалі іх. Таму і малака каровы мала давалі і быў у нас вялікі адыход цялят. Але калі ў 1933 годзе зоатэхнік пачаў з намі праводзіць гутаркі аб лепшым доглядзе кароў і мы пачалі самі даглядаць прымацаваную да нас жывёлу, справа адразу палепшылася. Пачала я сама даглядаць цялятак ад сваіх кароў, і цяпер яны ўсе ў мяне захаваны і здаровенькія. Пасля месячнага ўзросту я іх перадаю цялятніцы.

Каровы мае целяцца на працягу ўсяго году. Зараз 7 ужо ацяліліся, і цяляткі ўсе гадуюцца. У Маскве я купіла для іх вядро, з якога буду іх паіць, бо ў нашых крамах такога добрага не знайшла.

Вось як я працую! А жыву я таксама добра. Яшчэ да ад'езда ў Маскву далі мне добрую кватэру, абсталявалі яе мэбляй. Партком і рабочком соўгаса арганізавалі ў мяне стаханаўскі вечар, дзе мяне віталі з перамогамі і прэміравалі.

У Маскве я многа бачыла. Каталася на метро, была ў мавзалеі Леніна, у тэатры, кіно, на фабрыках. Усюды нас рабочыя гасцінна сустракалі, як родных, блізкіх. Ну, а пра нашых кіраўнікоў і казаць няма чаго—гэта самыя блізкія, самыя родныя нам людзі. Яны так ветліва з намі размаўлялі, асабліва наш родны **Сталін**. Я моцна паціснула яму руку і здымалася разам з ім на картачцы.

Гэтых хвілін я ніколі ў жыцці не забуду. А калі таварыш **Калінін** уручаў мне вышэйшую ўзнагароду—ордэн Леніна, я ад радасці нічога не бачыла.

Мне нават не верылася, што я — адвечная батрачка, якую да совецкай улады ніхто за чалавека не лічыў, зараз атрымліваю такую ўзнагароду, абкружана такім гонарам і павагай.

Гэтую вялікую ўзнагароду я пастараюся яшчэ лепш апраўдаць. Буду працаваць яшчэ лепш, буду змагацца за поўнае выкананне лозунга, данага XVII парт-з'ездам, аб уздыме жывёлагадоўлі.

Инв. № 112

НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ

Каля месяца таму назад старшыня нашага калгаса т. Самахвалаў сказаў мне:

— Ведаеш, Ніна, хутка ты паедзеш у Менск на нараду перадавікоў жывёлагадоўлі.

З нецярпеннем чакала я гэтага дня. А калі 7 лютага мяне паведамілі, што паедзем мы спачатку не ў Менск, а ў Маскву, то радасці маёй зусім не было канца.

У цягніку ў мяне адна за другой варушыліся думкі. Многае хацелася пабачыць у Маскве, а больш за ўсё хацелася пабачыць любімага нашага правадыра таварыша **Сталіна.**

У Маскве гасцінна сустрэла нас пролетарская сталіца. Каталіся на метро, хадзілі ў тэатр, у кіно, у музеі. Вялікія былі ўражанні, але найбольшыя ўражанні засталіся ад самой нарады.

Ніколі не забуду, як сустракалі мы таварыша Сталіна. Ад радасці на вачах у мяне навярнуліся слёзы. З усёй сілай я апладыравала і крычала «ўра». Кожны рух таварыша Сталіна запомніўся на ўсё жыццё. І як усміхаўся, і як рукою нам махаў і, асабліва моцна запомнілася, як ветліва глянуў ён на мяне, калі я яму паціскала руку.

Чатыры дні працягвалася нарада. Уважліва слухала я выступленні ўсіх дэлегатаў. Пабачыла людзей нашага Саюза. Гаварылі на розных мовах, але ва ўсіх была адна думка. Кожны дзякаваў таварыша **Сталіна** і совецкі ўрад за сваё шчаслівае жыццё.

Па ініцыятыве таварыша Сталіна амаль усе ўдзельнікі нарады ўзнагароджаны вышэйшай узнагародай—ордэнамі. У тым ліку і я атрымала ордэн—«Знак почета». Атрымала я яго за сваю працу. Два гады я працую свінаркай у калгасе. За 1935 год выпрацавала 467 працадзён. Выгадавала 90 парасят ад сямі свінаматак. Захавала цалкам увесь прыплод. Ад кожнай свінаматкі атрымала 50,8 пудоў мяса. У далейшым буду працаваць яшчэ лепш. На нарадзе ўзяла абавязацельства—у 1936 годзе даць з кожнай свінаматкі 25 парасят і 65 пудоў мяса.

Мне толькі 19 год. А як многа радасці ўжо ў маім жыцці. Перад ад'ездам у Маскву я выйшла замуж. Не думаў муж мой—ударнік нашага калгаса, што звярнуся я ордэнаноскай. Чакаю, як ён будзе рады.

Вышла замуж, а вяселле яшчэ не паспела справіць, толькі запісалася. Спраўлю вяселле праз некалькі дзён. Госці ў мяне будуць знатныя. Абяцалі прыехаць старшыня Соўнаркома Беларусі таварыш Галадзед і нарком Земляробства таварыш Бенек, якіх я запрасіла, будучы ў Менску.

АКСЁНЧЫК Ніна.

Уздзенскі раён.
Калгас „Калінінск".



Аксёнчык Ніна, узнагароджаная ордэнам „Знак Почета".

Самая маладая ордэнаноска 17-гадовая Надзя Зенько, узнагароджаная ордэнам „Знак Почета".

У прымежным калгасе

Па ўсяму Совецкаму Саюзу ва ўсіх нашых установах вісяць партрэты нашага правадыра любімага таварыша **Сталіна.** І ў мяне ў праўленні вісіць вялікі партрэт правадыра. Але ў маім габінеце вісіць яшчэ адна картачка, на якой зняты таварыш Сталін. І дома ў мяне вісіць такая-ж картачка. На ёй і я знята разам з правадырамі нашай партыі і ўрада. Здымак гэты зроблен у Маскве, куды я мела шчасце быць пасланай дэлегаткай на VII з'езд Саветаў і на II з'езд калгаснікаў-ударнікаў.

Хіба можна апісаць маю радасць, калі я апынілася разам з нашымі правадырамі ў адным залі? Нават слёзы на вачах выступілі. А як абрадваліся мы, калі ўвайшоў таварыш **Сталін.** Зал грымеў ад авацый самаму дарагому, самаму любімаму правадыру працоўных усяго свету.

На ўсё жыццё запомніла я гэтыя дні. Мінула ўжо даволі багата часу, але дагэтуль калгаснікі ходзяць да мяне і я з радасцю расказваю ім пра ўсё, што адбывалася ў тыя гістарычныя дні ў нашай вялікай сталіцы.

Жыццё стала другім з тых часоў. Вочы ў мяне зрабіліся яснейшымі. Чытаю газеты. Усё ясна мне, усё зразумела. І вучуся я цяпер больш старанна. І дома ў мяне зусім новая абстаноўка. І мэбля, і кнігі. Вось толькі патэфона не хапае, але ў Менску я куплю.

Як працую я? Зразумела, што па з'езды я трапіла толькі таму, што добра працую. Аднак цяпер я пачала працаваць яшчэ лепш. Сельска-гаспадарчы год мы скончылі з гонарам і, ўжо вядома, не здамо ў падрыхтоўцы да новага года. Усе старыя нормы і дагавары мы змяняем. «Новыя людзі, новыя нормы»— сказаў таварыш Сталін. І мы— стаханаўцы сельскай гаспадаркі па-новаму пачалі працаваць, каб выканаць заданне вялікага правадыра—даць 7—8 мільярдаў пудоў хлеба!

Інакш і не можа быць. Бо нашы калгаснікі прайшлі асобную школу: дэмабілізаваныя чырвонаармейцы і наша беднята арганізавалі комуну на самай граніцы, якая ў 1933 годзе перайшла на статут сельска-гаспадарчай арцелі.

Нашы жывёлагадоўчыя фермы працуюць дужа добра. А даяркі сярод іх ёсць проста надзвычайныя. Высокая свядомасць і адданасць справе соцыялістычнага будаўніцтва вядуць да таго, што гэтыя людзі паказваюць сапраўдныя ўзоры большэвіцкай работы. Акрамя ўдзелу ў конкурсе на лепшую МТФ, яны заключылі адзін з другім дагавары на лепшы догляд за каровамі і маладняком. Лепшыя нашы даяркі—**Тоня Катушонак, Надзя Зелянкова** і **Феня Кісялёва.** Гэтыя людзі заслугоўваюць таго, каб пра іх ведалі не толькі ў нашым раёне, але і ва ўсёй Беларусі.

Старшыня калгаса
Серафімава Таццяна.

Ветрынскі раён,
калгас № стралк. дывізіі.

АДДАНАСЦЬ КАЛГАСНАЙ СПРАВЕ

З часу арганізацыі калгасу Філіповіч Марыля працуе даглядчыцай цялят. Раніцой і ўвечары яе заўсёды можна бачыць на ферме. Яна любіць сваю работу і працуе па-стаханаўску. Замест устаноўленай нормы ў 20 цялят, яна даглядае 35 і даваяла ўсіх сваіх цялят да вышэйсярэдняй упітанасці.

Сваю адданасць да работы Марыля паказала, калі цялё ў часе прагулкі трапіла ў рэчку. Не пашкадаваўшы свайго здароўя, Марыля кінулася ратаваць яго. Цялё засталося жывым, але сама яна хварэла два тыдні.

Праўленне калгаса ўлічыла гэты гераічны ўчынак і прэміравала яе 20 пудамі збожжа. Сваёй адданай работай Марыля ў гэтым годзе выпрацавала 862 працадня. Зразумела, што зараз яна стала сапраўды заможнай. На кожны працадзень прыпадае 2 з паловай кгр. збожжа і 9 кгр. бульбы.

Смалявіцкі раён. **Позняк.**

На здымку—старшыня Рышкаўскага сельсовета, Шклоўскага раёна т. Паўлючэнка і т. Серафімава.

ВЕРА МІХАЙЛАЎНА

Вера Міхайлаўна **Ліхашапка** ў 1930 годзе прышла да старшыні калгаса і сказала:

— Хачу жыць у калгасе, прыміце мяне ў сваю сям'ю.

Адказ быў выразны:

— Заўтра прыходзьце на работу.

І паставілі яе на ферму. З таго часу Вера Міхайлаўна бяззменна даглядае і дойць кароў. Спачатку ёй даручылі даіць 12 штук, а потым 18 і зараз 20.

Цяпер Веру Міхайлаўну ведаюць не толькі ў калгасе „Ленінскі шлях", яе ведае ўвесь раён. Слава пра яе работу выходзіць далёка за межы раёна—у брацкую украінскую рэспубліку. Аб ёй гавораць на раённых нарадах, у калгасах.

У чым-жа справа, чаму так любяць і паважаюць Веру Міхайлаўну?

А справа вельмі простая. Вера Міхайлаўна за 1935 год дабілася ўдойнасці з кожнай каровы па 3040 літраў малака. Выяўляючы малочныя асаблівасці кожнай каровы, вывучаючы іх характар, іх звычкі, добра арганізаваўшы догляд, Вера лёгка дасягнула сваёй мэты. Карова „Буйная" дала за год 3810 літраў.

Тав. Ліхашапка.

— Я буду змагацца,—кажа Вера Міхайлаўна,—каб ў 1936 годзе дабіцца ад кожнай каровы 4000 літраў, а ў 1937 годзе—4500 літраў. І гэтага даб'юся.

Адыйшоў той час, калі на кавалак хлеба прыходзілася гараваць гадамі. Адыйшоў ён назаўсёды.

Сёння Вера Міхайлаўна—стаханаўка жывёлагадоўлі. Калгасны лад прынёс у яе хату пшанічны хлеб, сала, мяса, грошы. Сын яе вучыцца, ды і яна чытае газеты, кніжкі.

Неўзаметку пралятаюць часы работы. Гэтымі днямі, ідучы да дому, Вера ўбачыла на сцяне ля праўлення калгаса паперку, у якой значылася, што сёння дэманструецца кінофільм „Сяляне".

— Абавязкова пайду,—па вуснах прабегла вясёлая ўсмешка. Яе вочы, яе твар гарэлі маладосцю і радасцю шчаслівага жыцця.

Курловіч.

Камарынскі раён

Стаханаўскі злёт

У нядзелю 16 лютага, як толькі зайшло сонца, дзед Марцін і бабка Зося апрануліся ў новыя гарнітуры і накіраваліся ў клуб. У клубе іх спаткаў старшыня калгаса „Ільіч" тав. Кулеш. Дзед з бабкай занялі месцы ў першых радах. Іграў духавы аркестр. Моладзь і пажылыя калгаснікі танцавалі вальс. Велізарны зал калгаснага клуба быў напоўнены радасцю і шчасцем. Дзед Марцін нецярпліва сядзеў на сваім месцы. Злёт неўзабаве пачаўся. Абіраючы прэзідыум, тав. Пархомчык старшыня сельсовета ўнёс прапанову ўвесці ў склад прэзідыума дзеда Марціна і бабку Зосю. Зал здрыгануўся ад дружных воплескаў прысутных, калгаснікі і Дзед Марцін з бабкай Зосяй, пад бадзёры марш духавога аркестра, занялі месцы ў прэзідыуме.

Адзін за другім пачалі выступаць калгаснікі, калгасніцы і расказваць аб сваіх стаханаўскіх метадах работы. На трыбуну вышаў і дзед Марцін. Усміхаючыся ён сказаў:

— 42 цялёнка я прыняў дрэннай упітанасці, а зараз усе гэтыя цяляты вышэй сярэдняй. За 1955 год выпрацаваў я 450 працадзён. Не адстае ад мяне і жонка. Спраўляе ўсю хатнюю работу ды яшчэ ў калгасе выпрацавала 200 працадзён. Сын следуе нашаму прыкладу, добра працуе дарожным арганізатарам. Яго прэміравалі грашыма ў суме 300 руб. і грамату з Масквы прыслалі. Наогул ваша сям'я за 1935 год выпрацавала ў калгасе 1550 працадзён. На працадні мы атрымалі: 108 пудоў збожжа, 950 пудоў бульбы і грашыма 310 руб. Сям'я мая доб а апранута. Кожны мае па некалькі пар абутку, талы як раней адна пара была на ўсю сям'ю, а працавалі мы больш як зараз. Ніхто не ганіў нашай работы, а зараз я і жонка лічымся стаханаўцамі, не гледзячы на тое, што нам больш чым па 70 год.

Пасля прамовы дзеда Марціна калгаснікі віталі бабку Зосю. На вачах у бабкі ад радасці выступілі слёзы.

— Дарагія мае!—звярнулася да прысутных бабка.—Дзякую вам за пашану да мяне. У 1936 годзе я выпрацую не 200, а 300 працадзён. Яшчэ раз дзякую вам і нашаму таварышу Сталіну, які даў нам гэта радаснае і шчаслівае жыццё!

Гучныя воплескі і крыкі „ура" усёй залы завяршылі бабчыны словы. Пасля дзелавых пытанняў злёта пачалася мастацкая частка, падрыхтаваная драмгуртком калгаса імя Красіна.

* * *

У чатыры гадзіны начы разыязджаліся да дому стаханаўцы—лепшыя людзі сельсовета. Яны ехалі з вялікім прылівам свежых сіл і бадзёрасці.

М. Янкоўскі.

Капыльскі раён.

ПЯЦІСОТНІЦЫ-ЗВЕННЯВЫЯ ЗА ВУЧОБАЙ

Дзень выдаўся на славу. З неба церусіўся дробны мяккі сняжок. З усіх калгасаў да будынка Вяжаўскага сельсовета збіраліся звеннявыя калгасаў. Адны прыязджалі, другія ішлі пешкі. У сельсовеце прыбываючых калгасніц рэгістраваў аграном МТС.

У 12 гадзін дня 48 звеннявых—арганізатараў высокага ўраджая ільну—былі ў поўным зборы.

У раёне раз орнуты паход пяцісотніц за 500 кгр ільну з гектара. І таму парашылі, што ўсе звеннявыя павінны прайсці кароткатэрміновыя курсы і вывучыць агратэхніку ільна.

Курсанткі з выключным інтарэсам і актыўнасцю паведвалі заняткі. Вось у калгасе „Ударнік"—пяць звенняў, у калгасе „Чырвоны селянін"—6, у калгасе „1 май"—6. Ніводнага пропуску, ніводнага спазнення на заняткі не мелі звеннявыя гэтых калгасаў.

Пяць дзён лепшыя людзі калгасаў сельсовета асвойвалі агратэхніку, пяць дзён упарта і настойліва авалодвалі тэарэтычнымі ведамі.

Як будуецца расліна? Што неабходна для яе росту і жыцця? Чым угнаяць глебу і як яе апрацоўваць? Гэтыя пытанні, звязаныя з барацьбой за высокі ўраджай, асабліва цікавілі звеннявых. Учора яны працавалі ў калгасе—сеялі лён, убіралі, апрацоўвалі і здавалі пролетарскай дзяржаве. Сёння за кніжкай вывучаюць агратэхніку, рыхтуюцца да новых баёў за высокі ўраджай, за ажыццяўленне ўказанняў правадыра народу таварыша **Сталіна**—даць у бліжэйшыя тры—чатыры гады 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Курсы скончылі 43 звеннявых. З іх 9—на „выдатна": **Доўгая** Марыля Ісакаўна, **Доўгая** Марыля Мікалаеўна, **Аксюта** Варка, **Верамей** Соня (калгас „Чырвоны селянін"), **Кулакоўская** Пелагея, **Астроўская** Вера (калгас імя Будзённага), **Барадаўка** Надзя, **Харкавец** Пелагея (калгас „Ударнік"). 21—скончылі на „добра" і 13—на „здавальняюча".

У дзень выпуска курсаў сельсовет наладзіў сямейны вечар і арганізаваў сустрэчу звеннявых са старшынямі калгасаў. Тут звеннявыя ўнеслі рад каштоўных прапаноў па падрыхтоўцы насення да сяўбы.

Звеннявая калгаса імя Будзённага тав. **Кулакоўская** раней, чым ускрыць недахопы ў падрыхтоўцы калгаса да сяўбы, прачытала напамяць лекцыю, як трэба вырошчваць і апрацоўваць лён і падзяквала таварыша Сталіна за добрае жыццё. Зал вітаў яе воплескамі.

Скончыўшы курсы, звеннявыя прышлі ў калгасы. Усе яны ўзяліся за работу, як бяруцца людзі, якія добра ведаюць сваю справу. Звеннявыя калгаса „Ударнік"— Харкавец Пелагея і Надзя, Корбан Алена, Барадаўка Надзя, Жыўно Тэкля і Выдранка Соня ўзяліся за прарашчванне насення ільну хатнім спосабам, арганізавалі збор курынага памёту і попелу. Імі ўжо сабрана 6 цэнтнераў.

Звеннявыя калгаса „1 май" правялі ў калгасе з жанчынамі стаханаўскі дзень па збору попелу. За адзін дзень яны сабралі 10 цэнтнераў попелу і 25 цэнтнераў курынага памёту. **Александровіч** Марыля сабрала тры цэнтнера, **Калеснік**—2,5 цэнтнера. Калгасніца **Александровіч** Ірына вывезла за гэты дзень на ўчастак 48 вазоў гною, замест 16 планавых.

Вялікую работу правялі па арганізацыі сваіх звенняў звеннявыя—стаханаўскі калгаса „Чырвоны селянін".

Так, гэта магутная, маладая сіла—пяцісотніцы—звеннявыя калгасаў рыхтуюць высокі ўраджай ільну. Іх у раёне 600 чалавек. 200 з іх ужо скончылі курсы і зараз праводзяць вялікую работу па арганізацыі звенняў і падрыхтоўкі насення і ўчасткаў да сяўбы.

Е. Прахарэнка.

Чашніцкі раён.

У Віцебску ў выходны дзень.

ГАСПАДАРЫ ЗЯМЛІ

У праўленні калгаса «Праметэй» дзверы шырока адчынены. Каля іх стаяць дзве зялёныя ёлачкі. Ля ганку на прытаптаны снег кінут пушысты аксаміт хвоі. Шум і гаворкі. Па святочнаму апранутыя калгаснікі стаяць на ганку, абменьваюцца вясёлымі жартамі і, выкурыўшы папяросу, зноў вяртаюцца туды, дзе пад гукі музыкі калгаснікі дзеляцца сваімі ўражаннямі.

— Калі тав. **Янкелевіч** ад імя Райвыканкома ўручаў мне акт на вечнае карыстанне зямлёй, у мяне сэрца задрыжэла, так светла зрабілася і радасна,— кажа старшыня калгаса тав. **Маслакоў.**

У яго энергічны твар, каля губ глыбокія складкі.

— А дзеда нашага здорава падчапіла! Ніколі не выказваўся. А сёння пра памешчычую ўправу расказваць пачаў,—заўважае рахункавод калгаса.

І сапраўды, васьмідзесяцігадовы дзед **Каваленка,** абкружаны моладзю, расказвае:

— Хіба вы бачылі бяду? Не! Цяпер жыццё стала такім радасным, што хочацца жыць і жыць. А вось мне няма чым успомніць сваю маладосць. Зямлі ў нас было па кавалачку—павярнуцца няма дзе. А зараз—прастор, вокам не абняць, усюды наша зямля! Толькі працуй. Цяпер мы самі гаспадары, а раней батрачылі ў памешчыкаў, а яны нас за людзей не лічылі.

— Эх, і ўспамінаць не хочацца сваё ранейшае жыццё!—адазвалася хударлявая жанчына з шэрымі вачыма.

— Раскажы, Ганна, як жылі раней?—просяць дзяўчаты.

Пажоўклы сухі твар жанчыны робіцца строгім і задумлівым. Яна кідае ўважлівы погляд на шчыльна апранутую фігуру прыезджага і пачынае гаварыць:

— Вось таварыш казаў аб цяжкім сялянскім жыцці пры памешчыках. Правільна казаў. Так усё і было. Мы—сяляне без зямлі сядзелі, галадалі, ды на памешчыка працавалі. А што з намі рабілі? Дзед Змітро расказваў, як чалавека на смерць эканом забіў. На маіх вачах ляснік таксама забіў чалавека за тое, што дрэва ў панскім лесе ссек. Маленькай была я, грыбы збірала, чую стук сякеры, дрэва павалілася. Потым селянін з лесу вышаў, а ляснік—тут як тут. Стрэліў—і забіў чалавека.

— А рана ты, бабулька, працаваць пачала?

— Дзіцём яшчэ. З васьмі год у чужыя людзі пашла. Вось так і гаравала ўсё жыццё ў беднасці, пакуль наша ўлада не дала сялянам волі. Вось зараз жыву і шкадую, што няма сілы ранейшай. На памешчыкаў усё здароўе патраціла. А як-бы яно зараз спатрэбілася. На сябе-ж працую. Не дрэнна жыву, што і казаць, а вось здароўе ўжо не тое.

Дудзянкова паправіла на галаве хусціну і хацела працягваць сваё апавяданне, але паплылі меладычныя гукі вальса. Стройна спявалі скрыпкі, гучэлі цымбалы і звінела мандаліна.

Як асеннія лісты кружыліся маладыя пары. На крылах прыгожага танца насіліся разрумяненыя калгасніцы. Вось мільгае чырвонай шоўкавай блузкай даярка **Фруза,** а за ёю плыве яснавокая ў белай блузцы Маня. Яны толькі што звярнуліся з фермы, дзе давалі каровам сена на ноч. Лёгка танцуюць яны пад гукі прыемнага вальса.

Але вось гукі музыкі спыніліся. Пачуліся размовы, стала шумна. Твары асвятліліся радасцю ад таго, што палітая потам дзядоў зямля атрымана навечна.

— Наша партыя, наш урад, наш любімы правадыр таварыш **Сталін** навечна далі нам зямлю, каб мы па-стаханаўску ўзялі ад яе нябачаны ўраджай. Наша краіна павінна сабраць у бліжэйшыя гады 7—8 мільярдаў пудоў хлеба. Так сказаў таварыш **Сталін** і мы гэта выканаем, — горача казала Моця **Арлова** — старшыня Чарнішкага сельсовета.—Наш Совецкі Саюз расце і мацнее, мы будуем новае жыццё. Але, калі вораг памкнецца на нашыя граніцы, мы здолеем даць рашучы адпор, мы здолеем пастаяць за сваю зямлю!

Калгаснікі згодна ківалі галовамі і радасна пабліскваліі вачыма. У баку моладзь дружна заспявала:

«По долинам и по взгорьям
Шла дивизия вперед»...

Владзімірава.

Лёзненскі раён

Андрэй Александровіч

НА ВЕКІ ВЯКОЎ

Мяне разбудзіў тэлефонны званок...
Зара разлівае рабінавы сок.
У стайні ў дарогу сядлаюць каня.
З трывогай з дарогі бяжыць цішыня
Ад гулкага поступу спелага дня.
Мяне ля дарог спатыкаюць бары...
Вядуць пераклічку ў палях трактары.
Праменні ліюцца праз тысячы сіт,
Абапал бяжыць баравы аксаміт.
Далёка плыве чоткі цокат капыт.
Прачнуўся лістом залаты лістапад...
Я еду ў калгас як таварыш, як брат.
Там свята сягоння, там росквіт прышоў,
Там радасць выходзіць з сваіх берагоў:
— Зямлю атрымалі на векі вякоў!
Спяшаюцца вёрсты і думкі і час.
Калгас весяліцца. Святкуе калгас.

29/X-35 года.

ЯРКАЕ ЖЫЦЦЁ

Зімні дзень цмяна прабіваўся ў вокны доўгіх карпусоў ленінградскай запалкавай фабрыкі. У гэты дзень работа ішла не зусім роўна. Усе чакалі брыгаду стаханаўцаў з Беларусі, якія прыехалі, каб дапамагчы выявіць прычыны, тармазіўшыя разгортванне стаханаўскага руху.

Асабліва нервова працавала Моця. Станок яе несупынна капрызнічаў, заядаў папяровую стужку і ламаў лучыну.

Але вось адчыніліся дзверы, у цэх уварваўся струмень халоднага, свежага паветра, а з ім гул ажыўленых галасоў. Вось яна чаканая брыгада ў суправаджэнні адміністрацыі фабрыкі! Наперадзе ўсіх між доўгага раду станкоў ішла маладая жанчына, са свежым тварам і светлымі валасамі. Яна зорка аглядала кожны станок і работніцу. Потым паскорыла крокі і падышла да здзіўленай Моці. Глянуўшы на брак, што ляжаў ля яе, яна пасяброўску прамовіла:

— Ну, чаго ты нервуеш? Трэба спакойна выявіць чаму капрызнічае станок, тады і наладзіць усё лёгка. Пусці мяне!—І сама стала на месца Моці.

Звыклай рукой яна ўключыла станок і пачала ўважліва прыглядацца і прыслухоўвацца да яго работы.

— А наша Оля працуе ўжо!—сказаў адзін з прыехаўшых разам з ёю.

У гэты час Оля выключыла станок і звярнулася да адміністрацыі:

— Калі ў вас пяцімінутка?

— Праз пятнаццаць мінут.

— Збярыце сход, ды паклічце сюды тых, хто рэжа лучыну. А мы, тым часам, азнаёмімся з астатнімі станкамі.

У час перапынку Оля горача абвінавачвала адміністрацыю.

— У вас станкі не ў парадку, а вы патрабуеце ад работніцы павышэння прадукцыйнасці працы і лепшай якасці фабрыката. Што робіць ваш тэхнічны персанал? Чаму ён не звяртае ўвагі на станкі?

— Пакажы, таварыш, гэтыя непарадкі, у чым яны? Мы акуратна сочым за станкамі!—успыхнуў цэхавы механік.

— Пакажу, таварыш, не хвалюйся! Хіба гэта парадак, што ў вас у станках няма спружыны, якая рэгулюе рух папяровай стужкі. А чаму ў вас шкла няма ў станках? Хіба ўсё гэта не тармозіць работу, хіба можа работніца ля такога станка не нерваваць? Лучыну даюць бракаваную. Яна тоўстая і таму ломіцца.

Адміністрацыя тут-жа дала распараджэнне ліквідаваць усе недахопы згодна ўказанняў тав. **Гузарэвіч**.

Рабочыя трох ленінградскіх запалкавых фабрык горача дзякавалі

Тав. Гузарэвіч.

Ольгу за таварыскі абмен вопытам. Асабліва свяціліся вочы ў Моці, яна абняла Олю без слоў. Галоўзапалкапром прэміраваў Ольгу Гузарэвіч механавым манто.

***

Стаханаўцаў прымаў нарком яснай прамысловасці тав. **Лобаў**

Оля дужа хвалявалася:

— Як-жа буду я расказваць пра стаханаўскі рух пры наркоме? Ды я ніводнага слова не здолею вымавіць...

Асабліва хвалявалася Ольга, калі ўвайшла ў прыгожы, белы зал са скульптурным упрыгожаннем, з багаццем карцін, люстраў і бронзы.

— Гэта казка... Хіба марыла я калі-небудзь убачыць гэтую прыгожасць?.. Нават у сне я не бачыла такога дзіва,—шаптала ў захапленні ўражлівая Ольга.

— Прыгожа, Ольга, праўда? Раней тут жылі графы, а цяпер гэта ўсё наша. Падарыў нам усё гэта вялікі Кастрычнік,—пачула яна каля сябе голас.

Азірнулася—побач стаяў старшыня ЦК Саюза і ласкава ўсміхаўся.

У габінеце наркома быў сервіраван парадны чай. Тав. Лобава сустрэлі бурнымі воплескамі.

— Не вы мне, а я вам павінен апладыраваць,—сказаў ён.

Ольга ўбачыла ветлівую ўсмешку і—палахлівасці як не было. Спакойна, без запінкі пачала яна расказваць аб тым, як перайшла працаваць на два станкі, як ездзіла з брыгадай у Ленінград і як дзялілася там вопытам сваёй работы.

Часта забілася сэрца, калі да яе звярнуўся тав. Праскуроўскі, начальнік Галоўзапалкапрома, якога яна ведала даўно.

— Скажы, Оля, ці не змагла-б ты працаваць на трох станках? Ва ўсім Саюзе ў нашай вытворчасці ніхто не працуе на трох.

Ольга падумала і сур'ёзна, як-бы ўрачыста, адказала:

— Даю абяцанне, калі прыеду ў Рэчыцу, перайду на тры станкі!

Нарком прэміраваў Олю Гузарэвіч 250 рублямі, а ЦК Саюза—400 рублямі.

Оля пабывала ў тэатрах і музеях.

Пяць дзён праляцелі нібы яркі сон, які запомніўся на ўсё жыццё.

***

Проста з вакзала Ольга накіравалася ў цэх. Звярнулася да майстра:

— Хачу працаваць на трох!

— Спрабуй, толькі не пасаромся...

Ольга пачала ўважліва аглядаць свае станкі. Сама пачысціла і змазвала іх. Некаторыя з работніц спрабавалі жартаваць:

— Жадная якая... З аднаго станка перайшла на два, а цяпер за трэці бярэцца.

А калі прагучэў гудок, тры станкі рытмічна застукалі.

Першы дзень прынёс Ользе радасныя вынікі—305 проц. Рабочыя згуртаваліся каля Оліных станкоў.

Яна стаяла з бліскучымі вачыма, з разрумяненым тварам, гордая сваёй перамогай.

У стаханаўскую змену Ольга дала 348 проц. і атрымала 18 р. 45 к., замест 6 руб., якія яна выпрацоўвала раней на фабрыцы.

Посьпех узняў Олю. Пасля прамовы таварыша **Сталіна** на нарадзе стаханаўцаў яна паставіла перад сабой задачу—вучыцца, авалодваць вышынямі тэхнікі. Оля вучыцца ў школе стаханаўцаў і збіраецца паступіць у тэхнікум. Шэфства над ёй для дапамогі ў вучобе ўзяў галоўны механік фабрыкі інжынер Шэмет.

Ольга Гузарэвіч не толькі сама вучыцца, яна дзеліцца сваім вопытам з таварышамі. У сучасны момант яна вучыць працаваць на трох станках выпускніцу фабзавуча Тамару Сужак.

Олю цэняць на фобрыцы. Усе прапановы, якія ўносіць лепшая стаханаўка фабрыкі, тут-жа абмяркоўваюцца і праводзяцца ў жыццё.

Трохкутнік фабрыкі прэміраваў яе абсталяваннем кватэры, але да гэтага часу куплен толькі ложак.

У Ольгі Гузарэвіч двое дзяцей: Ліда 8 год і Лёня 6 год. Яны ганарацца сваёй маткай.

Аднойчы ўвечары, калі Ольга і муж яе, які працуе на фанерным заводзе, пасля цікавага і складанага працоўнага дня ціха сядзелі за вячэрнім чаем, у дзверы пастукала суседка:

— Ольга, твае дзеці пакрыўдзілі маіх. Раней заўсёды разам гулялі, а сёння адмовіліся на адрэс.

— Чаму?

— Ды вось, заганарыліся. Кажуць: наша мама першая стаханаўка, а ваша—прагульшчыца. Мы не можам з вамі гуляць.

— Ну, тут нічога не зробіш. Мы іх не вучым, а табе трэба падцягнуцца і загладзіць прагул.

— Я дала ў цэху абяцанне направіцца. Дрэнна, калі нават свае дзеці не будуць паважаць.

Праездам праз Рэчыцу Олю наведаў брат—рабочы ляснога завода. Выслухаўшы аб тым, як сястра стала першай стаханаўкай запалкавай вытворчасці, ён усхвалявана абняў яе за плечы і прамовіў:

— Оля, былі мы з табой маленькімі сіротамі... А зараз совецкая ўлада зрабіла цябе знатным чалавекам і тваё імя запісана ў ганаровую кнігу. Хіба мы маглі марыць у стары час пра такую радасць?

Алмацінская.

Рэчыца.

Стаханаўкі Рэчыцкай запалкавай ф-кі т. т. Сту..зенкова і Ганчарова ў набівачнай машыны.

ПЕРШЫЯ СТАХАНАЎКІ

Фёдар нагнуўся і дастаў з засека шчэпаць цёплай мукі. Разгарнуўшы яе па сваёй мазолістай далоні, ён правяраў работу каменняў. Потым узняўся вышэй аж да самага каша і пачаў рэгуляваць доступ буйных зерняў.

Аддаўшыся поўнасцю рабоце, Фёдар не пачуў нават, як скрыпнулі дзверы і нехта ўвайшоў у млын. Перад ім, трымаючы ў руцэ невялічкую паперку, стаяла незнаёмая, маленькая дзяўчынка.

— Вы мельнік? Паперка вам з канторы.

Дзед прыхіліўся да засекаў і пачаў разглядаць неразборлівыя словы.

— Ага, ну вось і добра, т. **Ракава.** Працаваць, значыцца, са мною будзеш у млыне? Як-жа завуць цябе?

— Фруза!

— А акдуль-жа ты будзеш?

— Не тутэйшая я. З Мсціслаўскага раёна.

— А дома ёсць у цябе хто?

— Дома...

Фруза ўздыхнула.

Гэта балючае пытанне прымусіла Фрузу ўспомніць аб сваім цяжкім мінулым.

— Няма ў мяне нікога, акрамя дзядзі Грышы, у якога я жыла апошні час.

— Ну, нічога. Не палохайся, галубка. Палепшыцца і тваё жыццё. Заўтра-ж пачнем працаваць.

***

Памяшканне завадскога клуба запоўнілася рабочымі. Уважліва слухалі дакладчыка, які чытаў прамову таварыша **Сталіна** на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў.

Які вялікі гонар і слава быць стаханаўцам!—падумала Фруза.—Але як заваяваць гэту славу ў нас на млыне?

Гэта пытанне глыбока хвалявала Фрузу.

На заўтра яна сказала аб сваім жаданні таварышкам.

— Давайце, дзяўчаткі, заваёўваць славу.

— Добра—згадзілася Варка.

— Я, дзяўчаткі, так лічу,— дадала Фруза. — Узяцца нам утрох і дастаўляць на гэтым-жа кані збожжа са склада да млына і з млына на завод. Да гэтага часу пяцёра займалася гэтай справай. Такім чынам мы двух рабочых і каня вызвалім і зробім вялікую эканомію для завода, ды і зарплату сваю значна павялічым.

— Ого, ды ты ўжо, Фруза, і спланавала гэту вялікую справу. Трэба паведаміць дырэкцыю завода, — прапанавала **Трынькова.**

***

Радаваўся дырэктар завода—Палтаўскі. Сёння яму перадалі ад работніц—ініцыятарак стаханаўскага руху на спіртазаводзе важную паперку. У другі раз прыняўся ён чытаць яе. Пісалася коратка.

«Мы, работніцы завода—**Ракава** Фруза, **Пракоф'ева** Вара і **Трынько** Куліна бярэмся утрох даць патрэбную колькасць зярна для завода са склада на млын і з млына на завод.

Даем заводу значную эканомію».

19 снежня. Гэты дзень надоўга застанецца ў памяці рабочых Міхалінскага завода. За 8-гадзінны рабочы дзень работніцы Ракава, Трынько і Пракоф'ева перавезлі на адным кані 12 тон зярна да млына і 11 тон мукі на завод. А раней на двух конях упяцерых дастаўлялі ўсяго 10½ тон зярна на млын і 10 тон мукі на завод.

Узрасла і зарплата дзяўчат. Замест 3—3½ рублёў ранейшага дзённага заработку яны зараз зарабляюць па 14—15 рублёў кожная. Радуюцца дзяўчаты. Радуюцца яшчэ і таму, што яны далі вялікую эканомію заводу і заслужылі вялікую пашану сярод рабочых свайго калектыва.

П. Барысенка

Клімавіцкі раён.



Стаханаўка Віцебскай ф-кі „КІМ", член ЦВК БССР т. Норкіна ў сябе на кватэры.

РАСЦЕ АКТЫЎ ЖАНЧЫН

Абралі мяне членам заўкома і даручылі праводзіць масавую работу сярод работніц і жонак рабочых. Я ахвотна ўзяла гэтую нагрузку, але задумалася: з чаго пачынаць?

Сама я толькі пасля таго, як мяне абралі членам ураду СССР, пачала ліквідаваць сваю непраграматнасць. На дапамогу мне прышлі заводскія арганізацыі. Старшыня заўкома тав. Левін шмат дапамог мне. Прымацавалі да мяне настаўніка, які штодзённа са мной вучыцца. Зараз я ўжо добра чытаю і пішу. Навучылася задачы рашаць.

Тав. Левій дапамог мне скласці свой першы план работы. Перш за ўсё рашыла я арганізаваць актыў жанчын, які дапамог-бы мне ў правядзенні масавай работы. Такіх актыўных жанчын у нас на заводзе 40 чалавек. У большасці гэта жонкі стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Усе яны зараз уваходзяць у дэпутацкую групу і прымацаваны да бальніцы, сталоўкі, інтэрнатаў, дзіцячых ясляў і сада. Усе яны добра працуюць.

Часта праводзім мы гутаркі на кватэрах рабочых і работніц аб лепшым выхаванні дзяцей, сувязі са школай і ліквідацыі дзіцячай безнадзорнасці. У выніку гэтага дзеці пачалі лепш вучыцца і амаль для ўсіх дома арганізаваны дзіцячыя куткі.

Усюды нашых актывістак добра сустракаюць і задаволены іхняй дапамогай. Толькі загадчыку бальніцы тав. Школьнікаву не спадабалася дапамога жанчын. Ён заявіў, што кантроль яму непатрэбен. Але ўсё-ж такі жанчыны нашы не пакідаюць хадзіць у бальніцу і сочаць за чыстатой і за доглядам хворых.

Разы два-тры ў месяц збіраю я сваіх актывістак. Там яны адчытваюцца аб праведзенай рабоце, а таксама прапрацоўваем больш цікавячыя нас пытанні.

Прамову таварыша Сталіна на стаханаўскім злёце мы прапрацавалі на нарадзе актыва і на агульным сходзе жанчын. Там пастанавілі, каб усе жанчыны дапамаглі сваім мужам стаць стаханаўцамі. Для гэтага яны забавязаліся скласці дома такія ўмовы, каб, адыходзячы на работу, муж не нерваваўся, а думаў-бы толькі аб лепшым выкананні свайго плана: кватэру зрабіць чыстай і ўтульнай, вучыцца самім і дапамагаць мужам вучыцца, сачыць, каб дзеці былі вясёлыя і добра вучыліся, а муж змог-бы спакойна і культурна адпачыць пасля работы.

Член ЦВК СССР тав. Лёвачкіна—газаўшчыца шклозавода.

Быў у нас цікавы выпадак. Рабочы Бабкоў увесь час гаварыў сваёй жонцы, што ён стаханавец. Але калі жонка пабывала на агульным сходзе рабочых і даведалася, што ён не стаханавец, яна заплакала і звярнулася да мяне з запытаннем: што ёй патрэбна зрабіць, каб дапамагчы яму стаць стаханаўцам? Бабкова заявіла:

— Я нарадзіла 17 дзяцей—і з'яўляюся актывісткай, а муж на сваёй рабоце не змог стаць стаханаўцам. Я зраблю ўсё, што ад мяне залежыць, але ён павінен стаць стаханаўцам—перадавіком соцыялістычнай працы на заводзе.

Заўком дапамог ёй у гэтым і зараз тав. Бабкоў стаханавец. На сходзе дапрызыўнікаў Бабкова выступіла з успамінамі аб тым, як у стары час маткі праважалі сыноў у армію. Нямала слёз пралівалі яны.

— Зараз,—заявіла яна,—маткі весела і ўпэўнена праважаюць сыноў у Чырвоную армію, бо ведаюць, што яны будуць вучыцца, каб у патрэбны момант лепш абараняць сваю цудоўную радзіму. Я сама выгадавала добрага комсамольца—варашылаўскага стралка і з гонарам правяду яго ў Чырвоную армію. А старэйшы сын ужо чырвонаармеец і з'яўляецца выдатнікам вучобы.

Для ўцягнення жанчын у актыўную работу арганізавалі мы чырвоны куток работніцы і жонкі рабочага, дзе працуюць розныя гурткі.

У гуртку кройкі і шыцця вучацца 80 жанчын. Заўком закупіў для іх швейныя машыны, і яны навучыліся ўжо шыць. У гуртку рэгулярна праводзіцца палітгадзіна.

Удзельніцы асоавіяхімаўскага гуртка трэніруюцца хадзіць у супроцьгазах і да дня адчынення з'езда ЛКСМБ прыдуць у Менск у супроцьгазах.

У гуртку «ГСО» нашы жанчыны навучаюцца стаць чырвонымі сёстрамі. У стралковым гуртку займаюцца 11 жанчын. 5 з іх ужо поўнасцю здалі нормы на варашылаўскага стралка, а 6 здалі па дзве нормы. Да 8 сакавіка поўнасцю здадуць усе нормы.

Удзельніцы драмгуртка з поспехам выступілі на алімпіядзе мастацкай самадзейнасці. У фізкультурным гуртку, у гуртку парашутыстаў, пілотаў—усюды ўдзельнічаюць нашы жанчыны.

Зараз я намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў па правядзенню вылучэння жанчын на кіруючыя пасады і перасоўвання на больш кваліфікаваныя работы. Правядзем конкурс на лепшае выхаванне дзяцей і на чыстую, утульную кватэру.

Весела і ахвотна працую я. Мне склалі добрыя ўмовы жыцця і работы. Заводскія арганізацыі дапамагаюць мне ва ўсім. Дзеці мае добра вучацца. Сама я вучуся, жыву добра, і работа ў мяне спорыцца.

Анна Лёвачкіна.

Касцюковіцкі шклозавод імя Сталіна.

Ж А Н Ч Ы Н А

Б. МІКУЛІЧ

„Не пой, красавица, при мне
Ты песен Грузии печальной"
ПУШКИН

Радыст зняў навушнікі, павярнуўся да жанчыны і ахрыплым голасам, у якім выразна гучэла нервознасць, рэзка сказаў:

— Спаць ідзіце... Чаго вы ходзіце тут... дарагая!

Апошняе слова не вышла ласкава, а неяк груба, кпліва.

Жанчына паправіла хустку на плячах, твар яе захоўваў спакой. Лёгкай хадой яна прайшла тэрасу гасцініцы і па рыплівых усходках паднялася на другі паверх. Маленькая газоўка на цвіку чадзіла. Жанчына пагасіла яе, і ў пакой увайшло праз вокны мутнае світанне. Распахнула вакно. Вільготны вецер злёгку крануў хустку. Адчула холад, але вакна не зачыніла, а спынілася перад ім. Яна бачыла сівое, укрытае хмарамі, неба, награмаджэнне бясформенных скал, вузкую палоску дарогі ўнізе, выступ плоскай страхі. За дарогай ляжала рака, ракі не было відаць адсюль, над ракой поўз шэры туман.

«З сяла Казбек адкрываецца дзівосны від на вяршыну Казбека»,—успомнілася казённая фраза з даведніка для турыстаў. Яна ўзняла вочы і нічога не ўбачыла: туман, хмары і чорна-шэрая імгла ахутвалі неба. Доўга ўглядалася ў гэтую імглу, ведала: там павінна быць вяршына Казбека.

Жанчына адышла ад акна і спынілася перад раялем. Раяль быў стары, з пажаўцелымі клавішамі, на клавішах — сляды шматлікіх чалавечых пальцаў. Узяла ціхі акорд. Потым пасунула нагой крэсла і апусцілася перад раялем. Жанчына іграла. Гэта было ракатанне басоў. Ціхае, але трывожнае. Вільготны вецер напаўняў пакой. Нізка ішлі хмары, нібы чапляючыся за рамы вакна. Знізу, з тэрасы, чуўся ахрыплы голас радыста:

— Алло! Алло! Казбек!..

Было няўтульна, холадна і трывожна:

У Тыфлісе цвілі ружы. Лянівае мора абмывала нагрэты сонцам бераг Каблет. Па адхонню гор у Пасанаурах горда ўзніміліся да сонца дрэвы. На сонцы хвоя была празрыста-зялёнай, цень рабіў яе амаль чорнай, ахутанай сіняватай дымкай. У Пасанаурах—успомніла жанчына,—па двары гасцініцы бегалі прывязаныя вяроўкамі да калодаў двое медзвяжат. Калі падыходзіў да іх чалавек, медзвяжаты станавіліся на заднія лапы і жаласна раўлі. Тады чалавек працягваў рукі да медзвяжат і яны смакталі пальцы, трымаючыся пярэднімі лапамі за чалавека. Усюды была вясна, усюды пад сонцам было жыццё.

Жанчына моцна ўдарыла па клавішах пальцам. Пачуўся звон струны. Яна ўстала, зачыніла вакно, закуталася ў хустку. Спаць. Другія суткі яна без сна. Нервы напружаны былі да максімума. Усё навокал нервавалася. Але яна, яна стрымлівала сябе. Спаць. Спаць.

Не распранаючыся, яна паклалася на канапу. Заплюшчыла вочы, намаглася адагнаць думкі, але гэта не ўдавалася. І ў думках паўставала развітанне.

Ён смяяўся, белыя зубы яго бліскучалі, вочы гарэлі агнём маладосці, упэўненасці і рашучасці. Два таварышы яго ўжо вышлі. Ён спяшаўся.

— Віктар, я не хачу заставацца тут,—казала яна, трымаючы яго за руку.—Гэта бессэнсоўна заставацца аднэй. Я пайду з вамі.

Ён прыцягнуў яе да сябе, пацалаваў у шчаку і адказаў:

— Не, Елена, ты не пойдзеш з намі. У другі раз пойдзем, а цяпер не трэба. Мы будзем падніматца па нязведанаму шляху. Нам ісці не праз Гергецкі ляднік, як ішоў Джапарыдзе, і не праз Дэўдаркаскі. Хіба варта ісці па вытаптаных сцежках? Людзі ведаюць два шляхі на Казбек, але іх павінна быць 360.

— Але гэта небяспечна, Віктар.

— Пяць тысяч метраў, гэта-ж прагулка, Еленка,—і ён пабяжаў даганяць сваіх таварышоў.

Не, яна не магла заснуць. Кожную хвіліну здавалася, што яе клічуць з тэрасы. Яна прыслухвалася. Хрыплы голас радыста ды прыцішаны шум ракі. З гэтым радыстам яна пасварылася. Здалося, што папсавана апаратура, яна аб гэтым сказала, радыст вылаяў яе. Не, яна не магла заснуць. Яна ўстала, паправіла валасы і пайшла зноў на тэрасу. Вочы радыста сустрэлі яе незахаванай нянавісцю.

— Дайце мне навушнікі!

— Вы—д'ябал! Ну, што вы перашкаджаеце працаваць? Нуду толькі наганяеце.

— Дайце мне навушнікі і ідзіце спаць. Я за вас падзяжуру.

Перспектыва адпачыць сцішыла радыста. Няма адбою ад гэтых ненармальных турыстаў. Але сваю думку радыст не выказаў. Ён аддаў ёй навушнікі, пацягнуўся і запытаў:

— Хто ў вас там—брат, муж, сват?

— Таварыш. Ідзіце, я ўсё ведаю, не інструкціруйце.

— Таварыш. Хм,—ухмыльнуўся радыст.—І столькі клопату.

Жанчына надзела навушнікі. Цішыня. Такая-ж упартая, як туман, як шэрыя хмары. Раптам яна пачула нейкія невыразныя гукі. Яна ўслухоўвалася ў эфір. Але гукі былі не з эфіру. Тады яна павярнула галаву да дзвярэй.

У чалавека твар густа зарос валасамі. Толькі вялікі кручкаваты нос—чысты ад іх. Нізка на лоб насунута круглая шапка з авечае скуры. І проста з-пад шапкі на Елену ўтароплены былі ўпартыя цёмныя вочы. На шырокія дужыя плечы чалавека накінуты быў шынель. Чалавек сядзеў каля дзвярэй, глядзеў на жанчыну і ціха марматаў нейкую песню.

Гэты чалавек—махевец, праваднік. Ён дваццаць гадоў ходзіць на Казбек. Гэта прафесія яго роду. Стары бацька праваднікa помніць гордую, мізэрную, велічную і разгубленую постаць Александра Казбекі—пісьменніка і магната, джэнтлімена і пасту-

ха. Роду Казбекі належала гара Казбек. Што засталося ад Аляксандра? Бессмяротнае «Эліса» ды скромны помнік над прахам, а на Казбек ходзяць людзі. Дапытлівыя і адважныя. І махевец-праваднік ведае шлях на Казбек дасканала, і ведае, калі можна ісці на яго і калі ісці небяспечна.

Махевец спыніў мармытанне, падняў руку ўгору і сказаў:

— Там,—ён паказваў рукой у бок Казбека,—сёння дрэнна, вялікі снег.

Елена зняла навушнікі і прыслухалася да яго слоў.

— Вялікі снег,—паўтарыў махевец, і на барадатым твары яго ўзнікла ласкавая і сумная ўсмешка.—Трыццаць чалавек — гэта добра, тры чалавекі—гэта дрэнна і цяжка.

— Вы думаеце, што...

— Што я магу думаць... Я магу думаць рознае...

І ён зноў прытуліўся да дзвярэй сваімі дужымі плячамі і зноў пачаў спяваць, не спускаючы вачэй з жанчыны. Яму прыемна глядзець на яе: на рыжаватыя валасы, на зеленаватыя вочы, у якіх цепліцца даверлівасць і надзея, на тонкія цёмныя бровы і такія-ж цёмныя густыя расніцы. Ён глядзіць на жанчыну і думае: як хораша і ўтульна тут на тэрасе гасцініцы, калі наўкола туман і хмары, халодны вецер і мокрая імгла. Як хораша і ўтульна тут, і як дрэнна там, у снежнай мітульзе, за хмарамі, гэтым тром маладым людзям, якія ўжо чацверты дзень пакінулі цёплую гасцініцу.

Елена ўслухоўвалася ў эфір, у цішыню, у нязведанасць і раптам, трацячы сілу змагацца з сабой, закрычала, роспачна і надрыўна:

— Алло! Алло! Казбек!..

Потым сарвала навушнікі, пабяжала да пакоя радыста, застукала кулакамі ў дзверы.

— Не спіце! Як вы можаце спаць?!

На яе голас сабраліся людзі. Адны спачувалі, другія—заспакойвалі. Але праваднік спыніў песню, ён зноў узняў руку і ўжо без ласкавай усмешкі на твары сказаў да ўсіх:

— Там снегапад... Іх толькі трое.

Яго суровы голас прывёў у роўнавагу жанчыну. Яна кінулася да праваднка:

— Іх трэба выратаваць. Нешта здарылася. Вы можаце гэта зрабіць. Чаго-б гэта не каштавала, зрабіце.

— Жыццю цаны няма!

— Тады пайду я.

Сказаўшы гэта, яна супакоілася. Бровы сышліся і на пераносіцы ўзнікла зморшчына рашучасці. І твар ад гэтага набыў строгасць.

— Падшукайце праваднікоў мне і падрыхтуйце інвентар. Праз гадзіну я пачынаю пад'ём.

Праз сорак хвілін у дзверы яе пакоя пастукалі. Перад ёй стаяў махевец.

— Усё зроблена!

— Праваднікі?

— Вы пойдзеце са мной...

Іх праводзілі вялікай грамадой. Махевец ішоў наперадзе. Яна не адставала. Яны мінулі манастыр і павярнулі ўправа ад яго. Шэрыя голыя скалы, упрыгожаныя снежнымі вянкамі, адзначылі пачатак дарогі.

Праз дзве гадзіны гадыст прыняў першую вестку ад іх. Яшчэ праз паўгадзіны па шасэ прайшоў аўтабус з Тыфліса ў Орджанікідзе. У сталоўцы гасцініцы пачаўся абед. Турыст—іншакраінец, аглядзеўшы музей у доме Александра Казбекі, успомніў калісьці прачытаныя запіскі Дзюма аб падарожжы ў нагорную Грузію. Турыст вышаў на балкон і агледзеў пасяленне, плоскія стрэхі, напоўзруйнаваную сцяну з шэрага каменння наўкола музея і новыя чысценькія пабудовы ўздоўж шасэ. Над дзвярмі аднаго з домікаў вісела шыльда.

— Перакладзіце,—папрасіў турыст гіда.

І той пераклаў:

Школа калгаснай моладзі, а ў тым будынку змяшчаецца Хевскі райвыканком.

— Мерыя—спытаўся турыст.

Гід далікатна ўсміхнуўся.

Каля адной з хат хадзіла вялікая рабая карова. Яна часам спынялася перад дзвярмі кухні, тыкалася пысай у іх і патрабавальна мычэла.

Да райвыканкома пад'ехала машына. З яе вылез чырванатвары жылісты чалавек у шынелю. Праз некалькі хвілін павінна было распачацца пасяджэнне і гэта прыехаў сакратар райкома. Паседжанне абмяркоўвала план павелічэння пагалоўя калгаснага стада.

Шумела рака.

Меланхалічная дзяўчына-турыстка разглядала свежую партыю фотакартак. На іх быў Казбек, сфатаграфаваны ў радасны сонечны дзень. «Казбек, как грань алмаза, снегами вечными сиял»...

Ішлі гадзіны, ішоў дзень.

Аднойчы, калі радыст—грэшны чалавек, паклаў галаву з навушнікамі на далонь і заплюшчыў вочы, у гасцініцу шумна ўварваліся трое.

Радыст прахапіўся і затуманенымі дрымотай вачамі уставіўся ў прышоўшых.

— Ідзіце спаць, таварышы,—сказаў высокі юнак,—а я пайду супакою Еленку.

Радыст глянуў на яго і сон знік канчаткова. Радыст засмяяўся.

— Не спяшайся. Па вас паніхіду справілі. А дзе апарат, д'яблавы дзеці?—грозна запытаўся ён.

— Там, — махнуў рукой юнак.—Мы трапілі ў снегапад. Ісці было цяжка. Мы выбіваліся з сіл. Нам прышлося кінуць усё і апарат.

Радыст вылаяўся ў эфір і спалохана закрыў рукой рот. Трое зарагаталі. Тады на твары радыста ўзнікла ўрачыстая ўсмешка.

— Дазвольце перадаць вашай Елене прывітанне. Алло! Алло! Вы не спіце? Тысячу метраў? Сняжок? Спачуваю! Алло, слухайце! Куляйцеся назад! Чаго? Знайшлася прапажа!

Юнак схапіў радыста за руку, той ад болю скрывіў набухлыя губы.

— Як?—адно толькі і сказаў юнак.

Астатнія анямелі.

— Чэмпіён, забярыце свае рукі. Алло, каго даць? Мужа?—

Радыст павярнуўся да хлапцоў:

— Каторы муж?

Юнак сарваў з яго навушнікі і крыкнуў у эфір. І ў тую-ж хвіліну яму адказаў да болю знаёмы голас.

— Еленка! Еленка! — крычаў юнак, стукаючы кулаком аб стол.—Ты чуеш мяне, Еленка?

Прыбеглі служачыя гасцініцы. Турыстаў акружылі, распытвалі, прымушалі есці. Хораша было сядзець перад печкай, у якой

ЖАНЧЫНА (*Працяг*)

палаці сухія дровы. Прыемна было з глінянага жбана вялікімі глыткамі піць сухое халоднае віно. За вокнамі ішоў мокры снег. Стаяла глухая ноч. Радыст спыніў работу.

Зноў было світанне. Зноў ішлі над пасяленнем чорна-шэрыя хмары. Праваднік—макевец застаўся у сталовай. Елена падняцася наверх. Усе спалі. Яна спынілася перад ложкам, на якім спаў Віктар. Ён чакаў яе і не распранаўся. На твары жанчыны блукала стамлёная ўсмешка.

«Якая барада выросла!»—канстатавала яна.

Потым Елена падышла да стала, на якім ляжалі пакладзеныя Віктарам рэчы: запісная кніжка, кашалёк, рамень, брытва і ворах старых газет. Яна разгарнула запісную кніжку і ўсміхнулася: «Напомніць Еленцы. Не заплаціла за два месяцы ў комсамол. Васька падніме бузу». Яна ўзяла аловак і накоса напісала: «Выканана». Потым, прыводзячы ў парадак параскіданыя газеты, яна спынілася. На шостай старонцы аднаго з нумароў «Правды» было надрукавана:

«10 лютага група ў складзе 26 чалавек на чале з тав. Скарабагатавым прыбыла ў раён Тэберды (Карачаеўская вобласць). Тут альпіністаў папярэдзілі, што на перавале стаіць дрэннае надвор'е і ісці небяспечна. Не глядзячы на гэта, група вышла. Неўзабаве дваццаць чалавек вярнулася. Астатнія шэсць на чале з Скарабагатавым рушылі на штурм Клухорскага перавала. Карачаеўскія альпіністы, убачыўшы, што лютуе буран, вышлі на пошукі. Не даходзячы да Клухора, альпіністы знайшлі труп. Праз некаторы час была знайдзена замярзаючая група з чатырох чалавек. Яны былі выратаваны. У раёне Клухора праз некалькі дзён быў знойдзен труп Скарабагатава».

Яна засунула газету ў кіпу і адправілася спаць.

Махевец не спаў. Сонны афіцыянт слухаў яго і пазяхаў. Махевец гаварыў пра тое, які вялікі снегапад на Казбеку і як хораша піць сухое халоднае віно.

ЯНКА КУПАЛА

КОМСАМОЛУ

Гэй, ты, моладзь, наша змена,
Комсамольцы, комсамолкі,
Як-жа светла, як адменна
Свеціш колерам вясёлкі!

Маладой юнацкай славай,
Ці то ў зімку, ці то летам,
Нібы сонца, цуднай з'явай
Прамянееш ты ў сусветах.

Далей, вышай, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

Хто наперадзе са сцягам,
На якім красуе Сталін,
Пакарыў сваёй адвагай
Неразгаданыя далі?

Хто найшчыршыя парывы
Сваіх думак, свайго сэрца
Аддае Совецкім нівам,
Дрогнуць светам з сэрцам рвецца?

Далей, вышай, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

Ці то сушы, ці то моры,
Ці то высі паднябесся,
Усюды стрэнеш непакораў —
Комсамольцаў нашых з песняй.

Хай там бура, завіруха,
Хай пурга сапе і плача,
Стуль тваё пачуе вуха
Комсамольскі гарт юначы.

Далей, вышай, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

Чыя кірка ў падзямеллі
Першай пласт вугля цярэбіць
І чый трактар першым сцеле
Скібы на калгаснай глебе?

Чыя звоняць звонка косы
На мурожнай сенажаці,
Хто йдзе першым у пракосах
Што і ветру не дагнаці?

Глыбей, далей, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

Глянь, карабль плыве дасужна,
Дыміць комін параходны, —
Комсамольцы сям'ёй дружнай
Рэжуць хвалі ў шляху водным.

Ніпачым ім рыфы, скалы,
Ані смерчы, ні бураны, —
З маладым плывуць запалам
Цераз моры-акіяны.

Далей, вышай у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

Глянь у неба, ў стратасферу,
Дзе сягнуць не можа й вока,
Комсамолец неба мерыць,
Сячэ крыллем вал аблокаў.

З самалётам днём і ночай
Мігаціцца ў безгранічы,
Днём смяецца сонцу ў вочы,
Ночкай зорнай зоры ліча.

Далей, вышай, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

На фарпостах, на граніцах
Безгранічных нашых земляў
З карабінам пля стражніцаў
Комсамолец не задрэмле.

З ім не жарты, з ім не гулі, —
Сцеражыся, подлы вораг! —
Яго метка цэліць куля, —
Змеле злыдзеня на порах.

Далей, вышай, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты!

***

Я шчаслівы, што я разам
Пяю песні з комсамолам,
Пяём песні складным сказам
Ажно рэхі йдуць вакола!

Родзіць буйна наша поле,
Сады нашы, агароды,
Гудуць гулка з добрай волі
Нашы фабрыкі, заводы.

Далей, вышай, у прасторы
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры
Сталінскія арляняты!

Мінск, сакавік, 1936 г.

РОЛЯ СЯМ'І Ў БАРАЦЬБЕ З ДЗІЦЯЧЫМІ ЗАРАЗНЫМІ ЗАХВОРВАННЯМІ

Чалавек захворвае таму, што ў яго цела трапляюць мікробы, драбнейшыя нябачаныя простым вокам істоты, якіх мы можам убачыць толькі пры дапамозе асобнага павялічальнага прыбора—мікраскопа.

Шляхі ўзнікнення мікробаў разнастайныя, як разнастайныя і ачагі іх знаходжання. Мікробы, якія выклікаюць шкарлатыну, дыфтэрыт і адзёр, гнездзяцца ў большасці ў глотцы, разам са сліззю яны выкідваюцца хворым пры размове, кашлі, чыханні і заражаюць іншых. Высыхаючы, разам з пылам, трапляюць у паветра і заражаюць яго. Мікробы халеры, брушнога тыфусу, крываўкі і другіх звычайна змяшчаюцца ў кішачніку хворага і разам з калам і мачой выходзяць наружу.

Такім чынам самай галоўнай крыніцай заразных захворванняў з'яўляецца хворы чалавек, а самым верным сродкам барацьбы з'яўляецца своечасовая ізаляцыя хворага (адлучэнне хворага, змяшчэнне ў больніцу). Акрамя таго, змяшчэнне ў больніцу неабходна для забеспячэння правільнага догляду і лячэння, што спрыяе лепшаму ходу хваробы і дае менш ускладненняў.

Пры заражэнні некаторымі заразнымі хваробамі, якія праяўляюцца не адразу, а часамі праходзіць некалькі дзён (ад 1 да 14) захаванага перыяду. У гэты час ідзе барацьба абаронных сіл арганізма з мікробамі. Такі чалавек з'яўляецца ўжо носбітам заразы.

Разгледзім некаторыя заразлівыя хваробы і паглядзім, што павінна рабіць сям'я у справе папярэджання іх.

ШКАРЛАТЫНА часцей за ўсё распаўсюджана ў васеннія і зімнія месяцы. Самай асноўнай прычынай масавага распаўсюджвання яе з'яўляецца тое, што хворы знаходзіцца сярод здаровых. Хвароба перадаецца шляхам датыкання з хворым ці даглядаючым за ім, а таксама праз яго вопратку.

Захворванне шкарлатынай пачынаецца звычайна раптоўна. Ад 2 да 12 дзён цягнецца звычайна схаваны перыяд, а потым пачынаецца вангаванне, боль у горле, павышаецца тэмпература. На другі—трэці дзень з'яўляецца сып на грудзях і на руках, спіне і жываце, а на твары каля рота з'яўляецца бледны трыкутнік. Праз два—тры дні сып бляднее і, калі хвароба працякае нармальна, то надыходзіць перыяд выздараўлення. На трэцім тыдні пачынае лупіцца скура пластамі, працягваецца гэта да 42 дня хваробы.

У цяжкіх выпадках, хвароба працякае складаней і дае ўскладненні (запаленне почак, сярэдняга вуха, суставаў і іншае).

Часта, маласвядомыя бацькі, палохаючыся таго, што дзіця павязуць у больніцу, хаваюць дзіця і не адразу выклікаюць доктара. Гэтым яны прыносяць велізарную шкоду і свайму дзіцяці і абкружаючым.

ДЫФТЭРЫЯ—гэта заразнае захворванне слізістых абалочак рота, носа, вачэй. Перадаецца дыфтэрыя, таксама. як і шкарлатына, праз датыкальнасць з хворым, праз трэцюю асобу і праз розныя прадметы.

Захворваюць на дыфтэрыт галоўным чынам дзеці малодшага узросту. Выклікаецца ён мікрооам—палачкай Лёфлера і праяўляецца павышэннем тэмпературы, болем у горле, грубым кашлем.

Раней дыфтэрыт даваў вялікую смяротнасць, але з прымяненнем супроць-дыфтэрытнай сываратки смяротнасць значна знізілася.

З прычыны таго, што дыфтэрыя таксама можа мець цэлы рад ускладненняў і небяспечна для абкружаючых, неабходна своечасовая ізаляцыя. Пасля хваробы хворы доўгі час можа быць бацыланосоітам, а таму неабходна даследваць некалькі разоў у лабараторыі мазкі з яго рота і носа і толькі пасля гэтага дапускаць яго ў дзіцячы калектыў.

АДЗЁР. У вяснова-зімнія перыяды наглядаецца сярод дзяцей, асабліва малодшага ўзросту, даволі частае захворванне адзёрам. Перадаецца адзёр шляхам непасрэднага датыкання з хворым. Хворы бывае заразным чатыры дні да праяўлення хваробы і тры дні пасля знікнення сыпі.

Хвароба праяўляецца высокай тэмпературай, бранхітам, запаленнем слізістай абалочкі, а на 4—5 дзень выступае буйная сып. Схаваны перыяд праходзіць 14 дзён. Хвароба працягваецца каля двух тыдняў. У слабых дзяцей часта бываюць ускладненні на лёгкіх (запаленне лёгкіх), абвастрэнне сухотаў.

Адсталыя людзі думаюць, што адзёрам павінны перахварэць абавязкова ўсе дзеці. На самай-жа справе магчыма паспяховая барацьба з ім. Для гэтага патрэбна толькі прыняць рад папераджальных мер.

Асноўнай мерай з'яўляецца своечасовая ізаляцыя хворага і добрая дэзінфекцыя. Дзецям, якія датыкаліся да хворага, неабходна ўвесці некалькі кубікаў апрацаванай крыві дарослага, перахварэўшага адзёрам.

Што патрабуецца ад сям'і ў барацьбе з заразнымі захворваннямі? Перш за ўсё, унядрэнне санітарнай культуры ў быт. Мікробы любяць цёмныя, сырыя і брудныя памяшканні, затхлае паветра. Самымі вялікімі ворагамі мікробаў з'яўляецца—сонца, святло, вада і чыстае паветра. Значыцца, пытанне ўтрымання памяшкання ў чыстаце, праветрыванне, з'яўляецца неадрыўнай умовай у барацьбе з заразнымі хваробамі.

Не ўсе дзеці падпарадкаваны захворванню. Чым мацней і здаравей дзіця, тым лепш змагаецца яно з заразнымі хваробамі. Як-жа дабіцца таго, каб здароўе дзіцяці стала такім устойлівым? Апрача гігіены неабходна стварыць дзіцяці пэўны рэжым. Гэта значыць, што дзіця павінна своечасова есці, спаць, адпачываць, гуляць і т. д. Дзіця да аднаго году павінна спаць не менш 12 гадзін уначы і адзін раз удзень; з 6 да 8 год—11 гадзін уначы, старэйшыя—9—10 гадзін.

Неабходна прывучыць дзіця класціся спаць не пазней 9—10 гадзін вечара. Невыкананне рэжыма, недасыпанне вядзе да нервовасці, да дрэннага самаадчування, галаўных болей, зніжэння паспяваемасці ў школе. Неабходна стварыць нармальную абстаноўку сна.

Кожная маці павінна ведаць, што прывіўкі захоўваюць дзіця ад захворвання. Калі-ж захворванне ўсё-ж наступае пасля прывіўкі, дык яно працякае лягчэй і амаль не дае смяротнасці.

Успрыймальнасць пасля прывівак наступае не адразу (праз паўтара—два месяца). З гэтай прычыны мы наглядаем, што бацькі, не ведаючы гэтага, лічаць, што калі дзіця захварэла ў працэсе прывівак, ці пасля іх, то абвінавачваюць прывіўкі, альбо лічаць іх несапраўднымі.

Амаль немагчыма змагацца з заразнымі дзіцячымі хваробамі, калі сям'я не ўдзельнічае ў гэтым і не ізаліруе хворага.

Нашыя дзеці, маладыя кадры—самы каштоўны капітал у нас, і мы павінны яго захаваць, зрабіць моцным і дужым. Актыўная работа дактароў, санітарных арганізацый, школы і сям'і—вось рычагі, з дапамогай якіх мы можам ліквідаваць дзіцячыя заразныя захворванні.

Галоўны ўрач цэнтральнага дзіцячага дыспансэра МАОЛАВА.

НАМ ПІШУЦЬ

ШЧАСЛІВЫМ І РАДАСНЫМ СТАЛА ЖЫЦЦЁ

Заможнае, вясёлае і радаснае жыццё прышло ў хату кожнага добрасумленна працуючага калгасніка. Пышнай кветкай расквітае ў калгаснай вёсцы новая соцыялістычная культура.

Загляніце ў хату калгасніка сельска-гаспадарчай арцелі «Ударнік», Немайцянскага сельсавета КАРЫБЫ Мікодзія Іванавіча. Тут чыста і ўтульна. Сам Мікодзі Іванавіч пічыцца знатным чалавекам калгаса. На свае выпрацаваныя за год ударныя працадні ён атрымаў 130 пудоў зернавых, 520 пудоў бульбы, шмат іншых прадуктаў і 700 рублёў грашыма.

Раней Карыба ніколі не меў столькі хлеба. Толькі калгасны лад зрабіў былога батрака заможным.

Шчаслівым квітнеючым стала жыццё не аднаго толькі Карыбы.

Вось узяць хаця-б удаву ШАФРАНСКУЮ Ганну. Добрасумленнай працай Ганна зарабіла ў калгасе шмат хлеба і апрача гэтага атрымала 700 рублёў грошай.

У параўнанні з мінулым годам у калгасе значна павялічылася каштоўнасць працадня, на які прыпадае 3 кілограма зернавых, 12 кгр. бульбы і значная колькасць грошай.

Аднак на дасягнутых поспехах калгаснікі не спыняюцца. У адказ на гістарычную пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, калгаснікі ўзялі на сябе абавязак у 1936 годзе атрымаць з гектара не менш 5 цэнтнераў ільновалакна, 17 цэнтнераў зернавых і 250 цэнтнераў бульбы.

У нас ужо практычна прыступілі да рэалізацыі ўзятых абавязацельстваў. Насенныя і страхавыя фонды поўнасцю засыпаны і ачышчаны, заканчваецца рамонт сельгасінвентара, ужо завезена 17 тон мінеральнага ўгнаення, разгорнут збор попелу і вывазка на поле гною.

МАЛАХОЎСКІ.

Сенно.

НАШЫ АКТЫВІСТКІ

Да арганізацыі вулічных камітэтаў амаль ніхто не працаваў з неарганізаваным насельніцтвам. У 1934 годзе мяне абралі ў дэпутаты горсовета і далі нагрузку старшыні вулічкома. Адразу мы ўзяліся за скалачванне жаночага актыва. Зараз у нас ужо налічваецца 25 актывістак.

Наша вуліца была брудная. За кароткі перыяд працы актывістак шмат зроблена па дабрабыту нашай вуліцы: пасаджана 100 дрэў і 12 садзікаў, адрамантавана і ачышчана пяць калодзежаў, пракладзены тратуары і пастаўлена 50 метраў плоту.

Праводзім мы і масава-растлумачальную работу сярод хатніх гаспадынь. Прапрацавалі прамову таварыша СТАЛІНА на нарадзе стаханаўцаў прамысловасці і транспарта, камбайнераў і камбайнерак. Праведзены гутаркі на розныя тэмы, напрыклад, аб рэволюцыі 1905 года, 11 год без Леніна, аб выхаванні дзяцей і т. д. На свае сродкі мы арганізавалі гурток кройкі і шыцця, дзе навучаецца 27 жанчын.

Па падпісцы на пазыку мы вышлі ў першыя рады.

Шмат дапамагае нам старшыня горсовета тав. СЕЛЯЗНЁВА, якая амаль кожны дзень гутарыць са мною, дае ўказанні ў маёй працы. Нас, жонак рабочых і служачых, цікавіць работа фабрыкі, дзе працуюць нашы муж'я. Нядаўна мы заслухалі даклад дырэктара аб выкананні плана.

Сваю работу мы будзем праводзіць яшчэ лепш, каб перадаць свой вопыт другім вулічкомам.

ПЭЎЗНЕР.

Добруш.

***

Па прыкладу старшыні вулічкома тав. ПЭЎЗНЕР, я стала актыўна ўдзельнічаць у грамадскай рабоце. Спачатку тав. Пэўзнер доўга ўгаварвала нас хадзіць на сходы, а цяпер мы крыўдзімся, калі нас не клічуць туды.

Калі пачалі гаварыць аб стаханаўскім руху на фабрыцы, то мне было крыўдна, што мой муж не стаханавец.

Я з ім шмат гаварыла аб гэтым і даказвала, што ён проста лянуецца працаваць. А зараз я магу ганарыцца маім мужам. Ён стаханавец і прэміраван 200 рублямі.

Адчуваю, што жыць нам стала значна лепш. Дзяцей усіх я апранула, сабе і мужу купіла касцюмы. Палепшылася і харчаванне. Наша кватэра мае культурны выгляд.

Я вельмі люблю грамадскую работу, але мяне мала нагружаюць.

ЖЭЛДАКОВА.

Добруш.

Т. Мацылевіч—стаханаўка гваздзільнага завода „Чырвоны Кастрычнік" (Орша) вылучана зменным майстрам.

МАЛА ЎВАГІ ДА СТАХАНАЎКІ

На фабрыцы «Праца» ўжо 6 год працуе работніца тав. ЕШЧЫНА. Яна праяўляе сябе, як лепшая ўдарніца. Удзельнічае ў грамадскім жыцці фабрыкі, мае рад нагрузак. Яна адна з першых стала стаханаўкай, выконвае план на 200 проц. Але, на вялікі жаль, на яе мала звяртаюць увагі адміністрацыя і фабком. Прыкладам гэтага можа быць тое, што Ешчыну ні разу не прэміравалі. Я лічу, што тав. Ешчына заслугоўвае больш уважлівых адносін да сябе.

ШЭХТМАН.

Гомель.

АБЯЦАННЕ СВІНАРКІ

У 1934 годзе ў калгасе імя Леніна быў вялікі падзёж свіней. Але, калі на свіную ферму была прызначана АНЮТА ПАЛЯКОВА, становішча адразу змянілася. Анюта праявіла адданасць і любоў да сваіх абавязкаў і з першага-ж дня паставіла пытанне аб тым, каб знялі з работы тых свінарак, якія па-шкодніцку адносяцца да свіней. Анюта павяла барацьбу супроць абязлічкі і безгаспадарчасці на свіной ферме.

У рэзультаце любоўных адносін да сваёй работы з боку Паляковай і другіх свінарак свіная ферма калгаса імя Леніна выходзіць у перадавыя фермы раёна. У мінулым годзе на ферме налічвалася ўсяго толькі 7 штук свіней, а зараз ужо ёсць 52 шт. Акрамя таго 30 парасят сёлетняга прыплоду калгас прадаў калгаснікам.

На ферме не было ніводнага выпадка падзежа—вось рэзультаты работы сапраўднай выдатніцы жывёлагадоўлі—Анюты Паляковай. Любяць і паважаюць калгаснікі Анюту за яе работу.

На таварыскай гутарцы, якая была праведзена сакратаром РК КП(б)Б тав. Кацубам з выдатнікамі жывёлагадоўлі, Анюта першая дала абяцанне—у 1936 годзе змагацца не менш, як за тону апароса ад адной свінаматкі і за поўнае захаванне прыплоду.

Няма ніякіх сумненняў, што Анюта выканае дадзенае ёю абяцанне.

ШАПІРА.

Парыцкі раён.

Дар'я Кандрацьева—Стаханаўка калгаса „Чырвоная Зорка" (Віцебск.)

ВЫКОНВАЕМ СТАТУТ

У калгасе «Чырвоная змена», Шэйскага сельсовета, пасля другога з'езда калгаснікаў-ударнікаў, комсамольская арганізацыя павяла шырокую растлумачальную работу сярод калгасніц наконт 14 пункта сталінскага статута.

У гэтым годзе цяжарныя калгасніцы своечасова пайшлі ў адпачынак. Адпачынкам карысталіся: Лёкса КСЯНДЗОВА, Аўгіня БАРКАВЕЦ, Зося ПАРУЧЫК і іншыя. Да водпуска Лёкса Ксяндзова выпрацавала 240 працадзён. За час адпачынку ёй налічылі 20 працадзён.

У гэтым калгасе добра працавала дзіцячая пляцоўка, якой ахоплена было 45 дзяцей. З задавальненнем дзеці наведвалі пляцоўку. Прыходзячы дамоў, яны расказвалі аб фізкультуры, спевах і т. д.

Добрая пастаноўка работы дзіцячых устаноў забяспечыла хутчэйшае выкананне калгасніцамі палявых работ.

ВІНЭЙКА.

Крупскі раён.

ПАРУШАЦЕЛІ СТАТУТА

Па раду калгасаў Смалявіцкага раёна груба парушаецца 14 пункт сталінскага статута аб прадастаўленні адпачынку цяжарным калгасніцам. Напрыклад, у калгасе імя Леніна (старшыня Кленіцкі), не прадастаўлен адпачынак і не налічаны працадні цяжарным калгасніцам: Наталлі КОПАЦЬ, Любе КОПАЦЬ і іншым.

У калгасе «Полымя» (старшыня калгаса Мурашка) не налічаны працадні цяжарным калгасніцам: Юлі КУДЗІН, Паўліне КАЛЕКА, Анюце ГУРЫНОВІЧ і іншым.

У калгасе імя Сталіна, цяжарным калгасніцам: Магізе АСТАШОНАК, Марыі МАЛЕЦ і інш. не прадастаўлен адпачынак. Старшыня калгаса Мурашка і не думае аб прадастаўленні адпачынку.

У калгасе «Калгаснік Беларусі» (старшыня калгаса Дзергач), не прадастаўлен адпачынак 11 цяжарным калгасніцам: Зосі ФЕДОТАВАЙ, Вольцы МУРАШКА і інш.

Смалявіцкаму РВК неабходна звярнуць на гэта ўвагу і прыцягнуць вінаватых у парушэнні статута да адказнасці.

ДУБІЦКІ.

ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ КОМСАМОЛЬЦАЎ

Пытанне падняцця ўраджайнасці зацікавіла кожнага калгасніка. У калгасе «Асвета», па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі, арганізован агратэхгурток.

На першых занятках прысутнічала 50 чалавек, з іх 20 жанчын. З вялікай зацікаўленасцю прапрацавалі пытанне «Зямля і яе ўгнаенне». Для гуртка закуплена сельска-гаспадарчая літаратура. Слухачы добра рыхтуюцца да заняткаў. Гурток працуе два разы ў тыдзень.

Пасля першых заняткаў калгасніцы-стаханаўкі—Александровіч Дуня, Шамаль Матрона патрабавалі, каб заняткі праводзіліся кожны вечар.

Добрая работа комсамольскай арганізацыі ў калгасе «Асвета» бачна на кожным участку работы. Комсорг Каўшырка арганізаваў брыгаду дзяўчат па вывазцы дроў. Брыгада бераэліва адносіцца да каня. У першы дзень вывезлі па пяці кубаметраў, на другі дзень вывезлі па 7 кубаметраў на каня.

Лепшыя ўдарніцы і ініцыятары арганізацыі жаночай брыгады—Каўшырка, Александровіч, Русецкая і Міхалап, за добрую работу прэміраваны.

Комсамольская арганізацыя калгаса «Чырвоны пахар» шырока праводзіць работу сярод маладых дзяўчат. Няма дзяўчат ў калгасе непраматных. Штодзённа расце іх актыўнасць. За апошні час у рады чырвонасцяжнага комсамола прынята 6 дзяўчат. Арганізацыя смела вылучае іх на адказную работу і яны апраўдваюць сябе.

Раней малаграматная Наташа МАЦЮШОНАК далёка стаяла ад грамадскага жыцця, але пасля таго, як арганізацыя абкружыла яе вялікай увагай, дапамагла ёй ліквідаваць малаграматнасць, яна стала добрым важатым піянератрада НСШ. Наташа вельмі задаволена сваёй работай.

КАЎШЫРКА.

Клічаўскі раён.

Цана асобнага нумару 20 кап.

ЯК УПРЫГОЖЫЦЬ ЖЫЛЛЁ

325

Жыццё наша паляпшаецца з кожным днём. Мы робімся заможнымі, імкнемся да культуры, хочам жыць у прыгожым і ўтульным памяшканні. Але не заўсёды ўмеем стварацъ яго.

У невялікіх артыкулах мы хочам дапамагчы нашым чытачкам утульна і добра абставіць свае пакоі і кватэры.

У нашым памяшканні павінна быць шмат паветра і цяпла. Цяжкія цёмныя занавескі на вокнах выглядаюць непрыгожа і з'яўляюцца бясспрэчна шкоднымі. Нават лёгкія белыя кісейныя занавескі, якія закрываюць зерхняе святло, не карысны. Верхняе святло—самае неабходнае для зроку.

Замест суцэльных штор трэба рабіць занавескі з тонкай светлай матэрыі, якая лёгка мыецца. Умацоўваюцца занавескі на металічных прутах, альбо на шнурах, працягнутых упоперак вакна. На шырокіх вокнах звычайна робяць не суцэльную занавеску, а падзеленую на дзве палавінкі. Такім чынам, частка вакна можа быць адкрыта, а другая частка застаецца закрытай.

Занавескі робяць з матэрыі светлых, прыгожых колераў. Дужа падыходзяць аранжавыя занавескі: ад іх у пакоях прыемнае сонечнае святло. Ніжні канец занавесак можна аздобіць устаўкамі з рускіх карункаў ці аплікацый (малюнак з нашытых рознакаляровых кавалкаў матэрыі).

Усе тканіны, якія вісяць на сценках і на вокнах жылых памяшканняў, неабходна абтрасаць не радзей аднаго разу ў два—тры дні, а мыць—праз 12—15 дзён. Старую звычку ўбіраць памяшканне толькі перад вялікімі святамі раз назаўсёды трэба адкінуць. Чыстату ў пакоях трэба падтрымліваць сістэматычна, кожны дзень.

Ваконнае шкло, асабліва, калі вокны знаходзяцца ў першым альбо другім паверсе, дужа хутка забрудняюцца. Зімой, калі надворная рама зачынена наглуха, даводзіцца праціраць шкло толькі знутры пакоя. Мыць іх у гэты час гарачай вадой рызыкоўна—могуць трэснуць, а мыць халоднай вадой шкодна для рук. Шыбы вокан трэба праціраць чыстай трапкай, змочанай газай, альбо вадой з нашатырным спіртам, потым працерці іх паперай з крэйдай, і яны заблішчаць лепш чым ад мыла.

Расліны ў пакоях з'яўляюцца не толькі ўпрыгожаннем, але і карыснай рэччу. Яны ачышчаюць паветра. Аднак за кветкамі трэба даглядаць. Розныя віды раслін патрабуюць рознага догляду. Але ёсць агульнае правіла. Першае з іх—чыстата. З лістоў пакаёвых раслін трэба знімаць пыл, які засмечвае паверхню ліста і перашкаджае яму «дыхаць», гэта значыць паглынаць з паветра вуглекіслату. Шчыльныя і шырокія лісты трэба праціраць мяккай вільготнай трапкай, кветкі з дробнымі лістамі,—паласкаць у тазе з вадой. Расліну кладуць на бок, лістамі ў ваду і асцярожна спалоскваюць. Кветкі, якія падпарадкаваюцца нападу мошак, тлі, трэба мыць праз кожныя два—тры дні, дабаўляючы ў ваду табачны настой. Нельга мыць расліны, калі яны цвітуць, альбо завязваюць бутон. У гэты час іх трэба толькі апырскваць. Мыць і праціраць лісты пакаёвых раслін трэба зімой праз чатыры—пяць дзён. Летам — праз два—тры дні, а ў ніжніх паверхнях, дзе пылу больш—нават праз дзень.

Зімой ваду для мыцця кветак трэба наліць у таз і даць ёй поўгадзіны пастаяць, каб яна нагрэлася. Калі вокны прамярзаюць, трэба сачыць, каб лісты раслін недатыкаліся да абледзянелага шкла, што часта бывае прычынай пагібелі раслін. Асабліва асцярожным трэба быць з пальмамі, фікусамі, і другімі паўднёвымі раслінамі. На зіму іх лепш ставіць у глыбіні пакоя.

Усе кветкі з гаршкамі павінны стаяць на падстаўках, інакш будзе гніць падаконнік і ў пакоі завядзецца сырасць. На гаршкі з гліны можна зрабіць чахлы з каляровай рагожкі.

Калі жывыя кветкі ўпрыгожваюць пакоі і надаюць яму ўтульнасць, то грубыя папяровыя, альбо зробленыя з матэрыі кветкі сваёй яркай і стракатай каляровасцю могуць пагоршыць самую прыгожую абстаноўку. Да рэволюцыі папяровыя кветкі часта былі адзіным упрыгожаннем пакоя работніцы. Зараз яны—непрыемныя ўспаміны аб мінулай беднасці. Калі нельга дастаць жывых кветак, лепш паставіць у вазу прыгожую яловую, альбо сасновую галінку, чым стракаты папяровы букет, у які набіваецца пыл і гразь.

Прыгожасць і ўтульнасць памяшкання надаюць не аздабленне, а чыстата, прастор і добрая якасць мэблі. Малюнкі, фатаграфіі ў танных дрэнных рамках, а часта і зусім без рамак, пустыя флаконы з-пад адэкалону і стракатыя каробачкі на туалетным століку—уся гэта дробязь толькі збірае на сабе пыл а летам яе заседжваюць мухі.

Значна лепш і прыгажэй выглядае камод альбо туалетны столік, калі на ім стаяць тры—чатыры добрых і патрэбных рэчы. На чыстым, прыгожым абрусе з вышыўкай, альбо карункавай аправай—добра працёртае люстэрка, флаконы з адэкалонам, чахол для грабёнак, шкатулка для нітак, іголак і вазачка з жывымі кветкамі—вось зусім дастатковае ўбранне для туалетнага стала, альбо камода. Можна купіць аднаго — двух звяркоў з уральскага каменю: яны мастацкі зроблены і добра мыюцца.

На сценках можна павесіць мастацкія партрэты правадыроў у добрай аправе, два—тры малюнкі пад шклом. Фатаграфіі лепш трымаць у альбоме, у яшчыку стала, а не выстаўляць на відным месцы.

Трэба ўнікаць у пакоі занадта вялікай колькасці яркіх і стракатых колераў. Разнастайныя коўрыкі на сценах—крыніца пылу і любімае месца клапоў.

Неабходная прыналежнасць кожнага культурнага жылля—шафа, альбо паліца з кнігамі. Каб кнігі не запыльваліся, паліцу трэба завесіць прыгожай занавескай.

Фаміна.

Выданне ЦК КП(б)Б РЭДКАЛЕГІЯ

Адрас рэдакцыі: Мінск, Дом друку, 8-ы паверх, пакой 60. Тэл. 24-118

Друкарня імя Сталіна Заказ № 234 Тыраж 14.850. Уп. Галоўлітбела № Ш—5069.

Здана ў набор 1/III—36 г. Падпісана да друку 13/III—36 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.